незалежная газета

№ 2 (600) 14 студзеня 2009

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, па серадах



**Дабілася свайго**

Старонка 3



**Гей? У войска?**

Старонка 8

**Праграма «Белсату»**

Старонка 15

## У НУМАРЫ

**Востры дэфіцыт сродкаў у Беларусбанку**

Найбольшы банк краіны знізіў паказчык кароткатэрміновай ліквіднасці да 0,5. На пачатак 2008 году гэты каэфіцыент складаў 1,4. **Старонка 4.**

**Тут будуць амалоджваць слуг народу**

Новая бальніца Кіраўніцтва справаў прэзідэнта. Праект уражвае. **Старонка 8.**

**Першы раз**

19-гадовая Вікторыя Азаранка выйграла першы турнір у кар'еры паводле WTA. **Старонка 9.**

**Маленне праваслаўнага актывіста**

Піша Аляксандр Класкоўскі. **Старонка 5.**

**Лібералізацыя ў дзеянні**

нагадвае несмяротныя творы Салтыкова-Шчадрына. Піша Віталь Тарас. **Старонка 7.**

**Грамадства неананімных алкаголікаў, і дзякуй ТВ**

Калі тэлебачанне — гэта прагрэс і культура, то я супраць такога прагрэсу і культуры. Піша Наталка Бабіна. **Старонка 12.**

**Іна Афанасьева**

з прыпевам. **Старонка 11.**

**Газетка дзеткам**

Капітан Танака раскупляе ўсё. **Старонка 14.**

# 2000 баксаў з кожнага

Пасля атрымання крэдытаў ад МВФ ($2,5 млрд), Расіі (другая транша — $1 млрд у лютым) і $0,5 млрд ад Венесуэлы замежны доўг Беларусі дасягне 20 мільярдаў даляраў.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

У панядзелак Беларусь атрымала доступ да першае траншы крэдыту МВФ — амаль 800 мільёнаў даляраў. Дзеля атрымання гэтых грошай краіна дэвальвавала рубель і ўрэзала расходы дзяржаўнага бюджэту на 2009 год. Наступную трацціну Беларусь атрымае праз квартал — у выпадку калі будзе трымацца ўмоваў Фонду.

«У лютым мы атрымаем другую траншу крэдыту ад Расіі, МВФ пералічыць адзін мільярд, Венесуэла ўжо пералічыла паўмільярда даляраў», — сказаў у аўторак А.Лукашэнка.

Раней пра крэдыт ад Венесуэлы нічога не паведамлялася.

Беларусь выходзіць на новыя рэкорды ў замежных запазычанасцях. Па стане на 1 студзеня 2007 году сукупны замежны доўг (ураду, банкаў і прадпрыемстваў) складаў 6,8 мільярда даляраў, на 1 студзеня 2008 году — ужо 12,5 мільярдаў, на 1 кастрычніка 2008 году — 14,5 мільярдаў.

З улікам двухмільярднае расійскае пазыкі, якая не ўлічвалася ў кастрычніцкіх звестках, 2,5 мільярда крэдыту ад МВФ і грошай ад Уга Чавеса, доўг нашай краіны вырасце да 20 мільярдаў даляраў, або больш чым па 2000 даляраў на кожнага грамадзяніна, з немаўлятамі разам.

Пры тым зусім не факт, што ва ўмовах міжнароднага фінансава-эканамічнага крызісу беларускія ўлады змогуць абысціся толькі гэтымі пазыкамі.

Прыгадваецца Польшча 1970-х, якая таксама мерылася пабудаваць сацыялізм за грошы капіталістаў.

**Зміцер Панкавец**

Увага! Пачынаючы ад гэтага нумару газета будзе з'яўляцца ў кіёсках у Мінску — у сераду ад абеду, а ў рэгіёнах — у чацвер.

## Была -вацыя, стала -ляцыя

Паводле звестак Міністэрства эканомікі, за 12 дзён студзеня цэны на прадукты ў Беларусі выраслі на 10—50%.

Больш за ўсё падаражэлі рыба, садавіна і гароднiна. Паводле афіцыйных дадзеных, грэцкія крупы падаражэлі на 26,9%, рыс — на 20%, гарох — на 33,5%, кава — на 23%, чай — на 28%, алей — на 21,4%, рыба — на 44%, садавіна і гародніна — на 40—50%.

# Пенсіянераў пазбавяць падзаробку

Зменіцца і ўзрост выхаду на пенсію.

Распрацоўваецца законапраект, які вырашыць лёс пенсіянераў, што працуюць. Паводле словаў начальніка аддзелу развіцця пенсійнай сістэмы Галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Мінпрацы Таццяны Пагоньшавай, зусім забараняць пенсіянерам працаваць не плануецца. Будзе рэалізаваны іншы падыход да выплаты пенсіі на час працы: яна мае быць арыентаваная на актуальны заробак пенсіянера, а не на мінулы, зароблены за жыццё. Таксама плануецца «ўвесці абмежаванні пры высокіх заробках» — аж да нявыплаты. Колькі складае «высокі заробак» не ўдакладняецца. Мае змяніцца і ўзрост выхаду на пенсію. Законапраект мусіць быць распрацаваны да канца году.

**СМ**

## Ідэалагічны аддзел не дазволіў рэкламу «Нашай Нівы» ў метро

Заяўку мурыжылі месяц. Урэшце адказалі праз тэлефон: свабоднага месца няма.

«Наша Ніва» звярнулася з просьбай размясціць інфармацыйныя плакацікі ў вагонах метро адразу пасля дазволу на продаж праз «Саюздрук». Гэта было яшчэ ў снежні.

У рэкламнай службе метро былі не супраць, але патрабавалася ўзгадненне з ідэалагічным аддзелам гарвыканкаму.

Мы прынеслі туды ўзор — сціплыя аркушы А4, бо рэклама ў метро даволі дарагая.

Званілі раз, званілі два, званілі тры. Урэшце, амаль праз месяц, Эдуард Валянцінавіч Тамільчык, начальнік аддзелу масавых мерапрыемстваў, паведаміў... што рэкламныя плошчы на студзень у метро адсутнічаюць, і прапанаваў вярнуцца да гэтага пытання ў лютым.

Мы тут жа патэлефанавалі ў рэкламную службу метро. Так, кажуць, рэкламныя плошчы ёсць. Дый кожны можа пераканацца, што яны ёсць: пустыя планшэткі зеўраюць у вагонах. Крызіс жа.

**Барыс Тумар**




**У сувязі з гэтым маем чатыры рытарычныя пытанні:**

1) ці можа разлічваць на імідж «сяброўскай для бізнесу» краіна, дзе кожную рэкламку трэба ўзгадняць з ідэалагічным аддзелам?

2) колькі складае штат ідэалагічных работнікаў у краіне, калі іх хапае на вычытку кожнае рэкламнае аб'явы? І з якога крэдыту ён мае фінансавацца ў 2009-м — расійскага ці ад МВФ?

3) на якую рэпутацыю можа разлічваць ідэолаг пры такім падыходзе да справаў?

4) ці можа лічыцца справядлівай краіна, дзе законы маюць двайное дзеянне — для сваіх і для несваіх?

## СЦІСЛА

### Інфляцыя 13,3%

Інфляцыя ў Беларусі ў снежні 2008 г. склала 1,2%, у студзені—снежні — 13,3%, прыводзіць звесткі Нацыянальны статыстычны камітэт. У адпаведнасці з прагнозам сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2008 г. прадугледжвалася абмежаваць рост цэн у межах 6—8% за год. У 2007 годзе інфляцыя ў Беларусі склала 12,1%.

### Яшчэ адзін генерал за кратамі

Пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу супраць былога намесніка старшыні Пагранкамітэту генерал-маёра Яўгена Камарніцкага. Яму інкрымінуецца шматразовае атрыманне адкатаў за лабіраванне інтарэсаў камерцыйнай структуры, піша «Ежедневник».

### Царкву «Новае жыццё» выганяюць

Найвышэйшы гаспадарчы суд прыняў рашэнне па справе будынку мінскай пратэстанцкай царквы «Новае жыццё». Суд прызнаў, што грамада мусіць пакінуць займаны цяпер будынак. У 2002 годзе вернікі набылі на ўскрайку Мінску былы кароўнік і адрамантавалі за свае грошы. У 2005 годзе гарадскія ўлады забаранілі ладзіць там набажэнствы, а ў 2006 — пералічылі на рахунак царквы каля $17 тысяч кампенсацыі. Яшчэ 9 кастрычніка 2006 г. яны, паводле пастановы ўладаў, мусілі вызваліць будынак. На знак пратэсту вернікі распачалі 23-дзённую галадоўку-пост. У выніку справай вернікаў заняўся Найвышэйшы гаспадарчы суд. Ён адмяніў ранейшыя пастановы аб высяленні. І вынес новую.

### Праваслаўны каляндар на 2009 год

на беларускай мове падрыхтаваны Брацтвам у гонар Віленскіх пакутнікаў. Каляндар узбагачаны спісам усіх святых зямлі Беларускай з пазначэннем дзён іх памяці. Адзін з раздзелаў календара змяшчае ў перакладзе на сучасную беларускую мову «Дыярыуш» прападобнага пакутніка Афанасія Філіповіча і ўключае жыціі новакананізаваных святых Віцебскай епархіі і праведнай Манефы Гомельскай.

### Армія ЗША пераходзіць на электрамабілі

Яна атрымала першыя шэсць электрамабіляў маркі NEV (Neighborhood Electric Vehicle). Гэта толькі пачатак маштабных паставак на 4 тысячы электрамабіляў, якімі амерыканскія вайскоўцы будуць карыстацца на тэрыторыі ЗША.

**Паводле ЗП, МБ, Лявон К, ЯС, БелаПАН**

## Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю

Мы рэкамендуем і просім чытачоў падпісвацца праз Рэдакцыю. Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

1. Яна нам выгаднейшая фінансава.

2. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

3. Лічым важным захаваць сістэму самараспаўсюду дзейнай. Лішне тлумачыць, чаму.

Цана падпіскі праз Рэдакцыю **10 000 руб. на месяц**.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |

КВІТАНЦЫЯ

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 10 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazu дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы завялі традыцыю дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічаюць грошы на выхад газеты.

### Дзякуй

**Вользе А., Паўлу Л., Мікалаю С., Я.Ф., Леаніле Г., У.Л., Т.К., Наталлі Л., Ніне К., Васілю З., Антону М., Т.П., Юр'ю Я., Анатолю К., Уладзіміру З., А.Б., Мікалаю Ж., Аляксандру П., Алегу Т., Аляксандру Л., Валеру Ш., Аляксандру Ш., А.К., Людміле А., Валянціне П., Аляксандру Д., В.Л., А.Р., Міхаілу Г., Дзянісу Ш., Ніне К., М.Х., Уладзіміру Г., Івану К., Уладзіміру К., А.Л., А.Б., Б.Ш., Н.Ш., Наталлі З., Валеру К., Людміле Ж., Юр'ю Л., Уладзіміру С., В.Ц., Дзмітрыю В., Святлане В., Ігару Д., Зіне А., Але П., Валеру Ч., А.Ю., Лідзіі І., П.Д., Аляксандру Л., Аляксею В., Л.П., Уладзіміру З., В.Л., А.П.** з Мінску.

# Дабілася свайго

**Бескампраміснасць, катэгарычнасць, жорсткасць, працавітасць, адданасць кіраўніцтву — вось галоўныя рысы новай першай намесніцы кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Наталлі Пяткевіч.**


PHOTO.BYMEDIA.NET

У пятніцу 9 студзеня Лукашэнка правёў перастаноўкі ў Адміністрацыі прэзідэнта. Першым намеснікам Уладзіміра Макея стала Наталля Пяткевіч. Яна замяніла на гэтай пасадзе адыёзнага Анатоля Рубінава, чалавека сталінскіх поглядаў.

Наталля Пяткевіч разам з Віктарам Лукашэнкам, Уладзімірам Макеем, Усеваладам Янчэўскім адносяцца да наймаладзейшага пакалення чыноўнікаў. Часта менавіта з іхнімі імёнамі звязваюць курс на паляпшэнне адносінаў з Захадам. Хаця адназначнага меркавання, ці належыць Пяткевіч да лагеру «лібералаў», няма. Адны кажуць адно, другія — іншае.

Увогуле, Пяткевіч змагла трапіць у найбліжэйшае кола Аляксандра Лукашэнкі за максімальна кароткія тэрміны. Толькі ў 2001 годзе кіраўнік краіны звярнуў увагу на амбітную супрацоўніцу ўпраўлення дзяржаўнага і міжнароднага права Адміністрацыі прэзідэнта, прызначыўшы ўласным прэс-сакратаром, а ўжо праз тры гады яна заняла пасаду намесніка кіраўніка ўсё той жа Адміністрацыі. Усё гэта суправаджалася мностам чутак адносна таго, як маладая жанчына змагла так хутка ўзляцець у чынавенскай іерархіі.

Бескампраміснасць, катэгарычнасць, жорсткасць, працавітасць, адданасць кіраўніцтву — вось галоўныя рысы, якія зазначаюць у Пяткевіч. Нярэдка яна працуе нават у нядзелі. Падчас яе працы прэс-сакратарам Лукашэнкі фотакарэспандэнты атрымалі загад здымаць яе патрона толькі ў анфас, яна нават кіравала размяшчэннем тэлекамер, а таксама давала парады, што на якую паласу ставіць у друкаваным органе Адміністрацыі — газеце «Советская Белоруссия».

Яшчэ гавораць, што Павел Якубовіч не друкаваў матэрыялы з Адміністрацыі без подпісу Пяткевіч. Нават калі там стаяў аўтограф Нявыгласа.

Пяткевіч, як і яе начальнік, вельмі катэгарычная ў адносінах да апазіцыі. Хаця некаторы час прадстаўнікі АДС мелі ілюзіі наконт гэтай дамы, дасылаючы ёй лісты з просьбай дазволіць Еўрапейскі і Сацыяльны маршы, просячы аб сустрэчы. У першым выпадку спадарыня Наталля нават не палічыла вартым адказаць, а ў другім — напісала, што ўлады займаюцца рэальным вырашэннем сацыяльных праблем, а не ўдзелам у акцыях.

Падчас выбараў 2006 году Пяткевіч казала на апазіцыянераў, якія стаялі на Плошчы, што яны адпрацоўваюць заходнія грошы, а пра Казуліна — што ніякі не палітвязень, а ў Беларусі ўсё робіцца па законе.

Не дзіўна, што намесніца кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта трапіла ў спіс невыязных у краіны Еўрасаюзу. Прычым пад парадкавым нумарам 3. Перад ёй ішлі толькі Аляксандр Лукашэнка і Генадзь Нявыглас. Зрэшты, еўрапейскія санкцыі былі адмененыя ў мінулым кастрычніку.

Затое па сённяшні дзень дзейснымі застаюцца фінансавыя санкцыі ЗША супраць дзесяці беларускіх чыноўнікаў, у тым ліку і Пяткевіч. Афіцыйная трактоўка — «адказных за падрыў дэмакратычных працэсаў і інстытутаў, парушэнне правоў чалавека, дзяржаўную карупцыю».

Зрэшты, ёй усё адно ўдавалася падчас санкцый выязджаць за мяжу. Ці то ў Жэневу на пасяджэнні міжнароднай арганізацыі працы, ці ў Нью-Ёрк на пленумы ААН.

«Калі я прыязджаю ў ЗША, мяне разам з нелегаламі ў нейкі там «абез'яннік» вядуць, і я ў дзелавым гарнітуры сяджу там, покуль ідуць нейкія пакутлівыя тэлефанаванні. Самі супрацоўнікі адпаведных памежных службаў ЗША не разумеюць: ну маладая, быццам бы нармальная жанчына, што яна там робіць, незразумела, чаму ёй нельга прыехаць? Тым не менш, наведванне Нью-Йорку ўсё роўна абмежавана. Мы абмежаваныя 25-кіламетровай зонай, таму не паўсюль можна знаходзіцца», — неяк падзялілася яна з журналістамі.

Менавіта прывабнай Пяткевіч даверана кантакты з прадстаўнікамі Захаду. Акурат яна вяла перамовы з прадстаўніком Дзяржпэпартаменту ЗША Дэвідам Крэймерам, якія скончыліся вызваленнем трох палітвязняў. Увесь час сустракаецца яна і з дэлегацыямі Еўрасаюзу. Кажуць, што менавіта ў абавязкі Пяткевіч уваходзіць кантактаванне з Цімаці Белам.

Так ужо выходзіць, што менавіта гэтая «жалезная ледзі» беларускай палітыкі агучвае найбольш непапулярныя крокі ўладаў. Так было з ільготамі, калі спн.Пяткевіч прапаноўвала скасаваць іх цалкам (дарэчы, акурат яна займалася распрацоўкай гэтага законапраекту), з амністыяй, калі заклікала пакінуць за кратамі ўсіх жанчын з дзецьмі. Брала ўдзел у распрацоўцы закону аб СМІ, адначасова запэўніваючы, што інтэрнэту нічога не пагражае. Цікава, што падчас новага прызначэння Лукашэнка акцэнтаваў увагу Пяткевіч менавіта на пытанні СМІ, дзе, з ягоных словаў, апошнім часам «назіраецца застой».

Тым не менш, яна мела смеласць не пагаджацца з цвердалобай рэформай адукацыі, ініцыяванай Рубінавым, калі з іроніяй сказала, што, можа, варта адмяніць і ангельскую мову для выкладання ў школах і ВНУ, каб выпускнікі не выязджалі за мяжу.

За апошні год куды толькі не ссылалі Пяткевіч. Хадзілі чуткі пра яе прызначэнне старшынём Канстытуцыйнага суду ці кіраўніцай Белтэлерадыёкампаніі. Амбіцыйную жанчыну перспектыва такога перамяшчэння па ўладнай вертыкалі відавочна не задавальняла. Пра што яна адкрыта гаварыла журналістам.

Некалькі гадоў таму ў расійскіх СМІ з'явілася інфармацыя, што менавіта Пяткевіч можа стаць пераемніцай Лукашэнкі. Ёсць версіі, што гэта магла быць правакацыя з боку лагеру Шэймана, якія палохалі Лукашэнку магчымай канкурэнткай.

У 2007 з'явіліся вынікі апытання грамадскасці, праведзеныя НІСЭПД, дзе рэспандэнтам прапаноўвалася выказаць сваё стаўленне адносна некаторых чыноўнікаў. Па выніках апытання аказалася, што Пяткевіч даўяраюць амаль 30% апытаных. Разам з тым, нічога не чулі пра яе дзейнасць больш за 50%. Ніжэйшыя паказчыкі былі толькі ў Канаплёва і Шэймана.

Калі казаць пра сямейнае становішча жанчыны, то ў 2006 годзе ў Мінску цыркулявалі чуткі, што намесніца Адміністрацыі прэзідэнта развялася са сваім мужам Уладзіславам Пяткевічам, які ўзначальвае РУП «Нацыянальныя спартыўныя латарэі». Гаварылі, што менавіта жонка дапамагла Уладзіславу Мечыслававічу прабіць некалькі замежных (найперш арабскіх) крэдытаў, а таксама ўрадавыя гарантыі на гэтую справу. Цяпер Пяткевіча называюць адным з найбольш забяспечаных людзей у атачэнні ўраду.

У сямейства Пяткевічаў ёсць сын. Сама Наталля ніколі не хавала, што прыбягае да паслугаў няньні.

Яе бацька Уладзімір Краўчанка (яны ніякія не сваякі першаму міністру замежных справаў Беларусі Пятру Краўчанку) працуе галоўным доктарам у 7-й мінскай стаматалагічнай паліклініцы. У свой час менавіта на стол Пяткевіч патрапіў дакумент аб зацвярджэнні Краўчанкі звання «Ганаровы лекар Беларусі». Дачка выкрасліла прозвішча бацькі з спісу. Што праўда, ён яго ўсё адно атрымаў. Маці працуе настаўніцай.

Пасада першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта — чарговы віток у імклівай кар'еры валявой жанчыны. Чамусьці здаецца, што ён не застанецца найвышэйшым.

**Зміцер Панкавец**

**Падчас яе працы прэс-сакратаром Лукашэнкі фотакарэспандэнты атрымалі загад здымаць яе патрона толькі ў анфас.**

### Наталля Пяткевіч

нарадзілася ў 1972 годзе ў Мінску. Скончыла юрфак БДУ (1994). У 2001 годзе была прызначаная прэс-сакратаром Лукашэнкі. З 2004 году — намесніца кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта. У 2006 годзе ёй быў забаронены выезд у краіны Еўрасаюзу і ЗША, сёлета санкцыі былі адмененыя. Кандыдат юрыдычных навук. Кіруе адразу дзвюма спартыўнымі федэрацыямі — лыжных гонак і горных лыжаў і сноўборду.

КАМЕНТАР

## Не той чалавек

**Прызначэнне Наталлі Пяткевіч на пасаду першае намесніцы кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта — шэфа ідэалогіі — расчаравала тых, хто чакаў пераменаў у культурнай палітыцы рэжыму. Каментуе Барыс Тумар.**

У кулуарах абмяркоўваліся і іншыя кандыдатуры, з якімі звязваліся надзеі на спыненне саветызацыі, русіфікацыі і аслабленне татальнага ідэалагічнага кантролю, што нязменна былі асноўнымі мэтамі лукашэнкаўцаў.

Пяткевіч не той чалавек, каб мяняць гэты курс. Яна створаная гэтай сістэмай, абавязаная сваёй кар'ерай яе творцу. Без яго яе б не было. Калі А., ці Б., ці В. былі да яго і будуць пасля яго, П. абавязаная яму. Малаімаверны такі збег абставінаў, каб гэткі чалавек бачыў нацыянальны інтарэс у паступовым дэмантажы сістэмы, якая спутала Беларусь. Сістэмы, заснаванай на рэжыме асабістай улады, адсутнасці падзелу ўладаў, свабоды слова, сістэматычных фальсіфікацыях на кожным узроўні і дэвальвацыі нацыянальнай культуры.

Ніхто ніколі не чуў ад гэтай дагледжанай дамы ні слова па-беларуску.

Так, яна безумоўна імкнецца да мадэрнізацыі сістэмы кіравання — разумеючы, што ад таго залежыць самазахаванне, — і нават праводзіла пэўныя эфектыўныя рашэнні на сваёй ранейшай пасадзе. Некаторымі з іх, дарэчы, яна заслужыла непрыязь да сябе ў народных масах, амаль роўную непрыязі да Ярмошынай.

На пасадзе міністра замежных ці ўнутраных справаў, генеральнага пракурора ці кіраўніка Камітэту дзяржаўнай бяспекі Пяткевіч магла б стаць прагрэсіўным кіраўніком, які мадэрнізаваў бы дзейнасць гэтых інстытутаў. Але на пасадзе ідэолага Пяткевіч будзе аздараўляць маразм.

У год, калі рэжыму крытычна бракуе далярраў, гэта асабліва адказнае заданне.

# Вострыя дэфіцыт сродкаў у Беларусбанку

Найбольшы банк краіны — ашчадны банк Беларусбанк — знізіў паказчык кароткатэрміновай ліквіднасці (К2) да 0,5 на 1 снежня 2008 году. Гэтую інфармацыю падаў інтэрнэт-сайт банку. На пачатак 2008 году гэты каэфіцыент складаў 1,4.

Варта адзначыць, што найніжэйшага ўзроўню той каэфіцыент дасягаў на 1 лістапада — 0,3, а пасля ўзняўся.

Застаецца пытаннем, як банк вытрымае ўцёкі сродкаў з рахункаў, што распачаліся ў першых днях студзеня ў выніку ажыятажу, выкліканага дэвальвацыяй рубля.

Паводле правілаў Нацбанку каэфіцыент К2 для банкаў павінен складаць не ніжэй за 1.

Гэты паказчык характарызуе прапорцыю актываў банку тэрмінам пагашэння да 12 месяцаў і абавязкаў банку з тэрмінам выканання да 12 месяцаў.

Можна быць пэўным, што кіраўніцтва краіны не дапусціць неплатаздольнасці найбольшага банку краіны. Аднак патрэба ўратаваць Беларусбанк выклікае неабходнасць пошуку яшчэ аднаго значнага замежнага крэдыту. Папярэдне атрыманыя крэдыты ад Расіі і абяцаны крэдыт МВФ маюць на мэце папаўненне золатавалютных запасаў, што зніжаліся ва ўмовах змяншэння паступленняў ад экспарту.

Каб выправіць сітуацыю, Беларусбанк ізноў узняў стаўкі па дэпазітах у беларускіх рублях. Адначасова, як паведамляе сайт банку, стаўка па крэдытах зніжаецца аж на 5% пры ўмове вяртання крэдыту да канца 2009 году.

Гэтыя захады маюць палепшыць бягучы рахунак банку, які акумулюе 60% ашчаджэнняў беларусаў.

**Мікола Бугай**

**Беларусбанк падвысіў стаўкі па крэдытах на будаўніцтва**

Стаўка па крэдытах на фінансаванне будаўніцтва індывідуальных жылых дамоў і кватэраў для грамадзянаў, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоваў, падрасла да 20% гадавых. Крэдыт выплачваецца шляхам раўнамерных унёскаў у перыяд пагашэння. Для грамадзянаў, што не маюць патрэбы ў паляпшэнні жыллёвых умоваў, стаўка па крэдыце на фінансаванне будаўніцтва жылля падрасла да 25% гадавых. З банкам гэтая катэгорыя грамадзянаў разлічваецца за фактычны час карыстання крэдытам.

**СП**




PHOTOBYMEDIANET

## Лукашэнка: «Бегчы ў абменнікі не трэба»

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што сітуацыя на валютным рынку краіны стабілізуецца. Такую думку ён выказаў у час разгляду кадравых пытанняў, паведамляе БЕЛТА. Ён заклікаў людзей супакоіцца: «Усе задаюцца пытаннем: а як далей будзе? Далей будзе нармальна. Цана долара ў сярэднім узрасла на 400 рублёў. Гэта параўнальна няшмат, але мы падтрымалі работнікаў вытворчасці». Паводле словаў кіраўніка дзяржавы, беларусам не трэба «бегчы ў абменнікі і купляць па шалёных цэнах долары». «Невядома, што яшчэ будзе з доларам і еўра. Калі хто-небудзь хоча ўкласці свае грошы ў тавары — гэта правільна. Але купляць тры, пяць, дзесяць тэлевізараў або халадзільнікаў з разлікам на тое, што гэта добрае ўкладанне сродкаў, — гэта поўнае глупства, таму што цэны на тавары падаюць. Грошы трэба трымаць у банках», — сказаў Лукашэнка.

## Расія працягвае стаяць

**Значыць, і Беларусі варта рыхтавацца да крызісу працяглага і глыбокага.**

Перад Новым годам расійскай сацыялагічнай службай ФОМ было праведзенае даследаванне на 6000 рэспандэнтах, падчас якога высветлілася, што толькі за снежань у Расіі было звольнена прыблізна 2,9% працаздольных грамадзян, г.зн. 2,1 млн чалавек.

Агулам колькасць тых, хто кваліфікуе сябе як «беспрацоўны», складае амаль 10,9% ад колькасці працаздольных грамадзян Расіі, то бок амаль 7,9 млн чалавек.

АвтоВАЗ стаіць з 29 снежня да 2 лютага, завод Ford ва Усеваложску спыніў канвеер да 21 студзеня, Ульянаўскі аўтазавод (УАЗ) зладзіў вакацыі з 25 снежня да 9 лютага, КамАЗ спыніў галоўны канвеер з 19 снежня на месяц.

Для асобных кампаніяў скарачэнні дасягнулі пагрозлівых памераў. Так, інвестыцыйная група «Капіталъ» абвясціла аб звальненні 80% супрацоўнікаў, паводле «Сократили.ру», «Якутуголь» — 50%, МДМ-банк — прыблізна 40%. ААТ «Челябинская угольная компания» пазбавілася, таксама як і завод КамАЗ, 3000 чалавек, ААТ «Автодизель» — 2300 работнікаў, ГМК «Норильский никель» скараціў толькі ў цэнтральным апараце 220 чалавек і яшчэ 1150 чалавек на дачынных прадпрыемствах.

Спыненне вытворчасцяў у Расіі адаб'ецца на попыце на беларускія камплектуючыя. У такіх умовах спробы ўладаў захаваць поўную занятасць у Беларусі прывядуць да аслаблення фінансавай сістэмы краіны.

**МБ**



PHOTOBYMEDIANET

Пустыя паліцы ў крамах паціху змяняюцца павышанымі цэннікамі.

## Украіна ратавала Малдову і Балгарыю ад замярзання

Прэзідэнт Ючшанка распарадзіўся пастаўляць штодзённа 3,5 мільёна кубаметраў газу з украінскіх сховішчаў у краіны, дзе рэзервы газу вычарпаліся.

Пра тое ён паведаміў у лістах, скіраваных да прэзідэнтаў Балгарыі і Малдовы Георгія Пырванава і Уладзіміра Вароніна.

Балгарыя і Малдова цалкам залежаць ад Расіі ў пастаўках газу. Становішча гэтых краінаў ускладняецца адсутнасцю ў іх рэзерваў газу і марознай зімой.

Расія спыніла пастаўкі газу ва Украіну ад 1 студзеня і транзіт газу праз некалькі дзён пасля гэтага.

Тэхнічную праблему перадачы гэтых адносна невялікіх аб'ёмаў газу праз спустошаныя газаправоды вырашалі з дапамогай Румыніі. А Венгрыя ўратавала ад замярзання Сербію і Боснію, пастаўляючы мінімальна патрэбныя порцыі газу з уласных сховішчаў.

Расія абумоўлівала аднаўленне паставак газу падпісаннем пратаколу аб прысутнасці на газаразмеркавальных станцыях еўрапейскіх і расійскіх назіральнікаў. Украіна і ЕС прынялі такія ўмовы, каб аднавіць пастаўкі паліва замерзлым краінам Паўднёвай Еўропы.

Аднак аналітыкі сыходзяцца, што стратэгічныя страты Расіі могуць быць большымі за тактычныя перамогі. Пасля чарговага крызісу еўрапейскія краіны ўмацаваліся ў разуменні патрэбы правесці ў Еўропу газавую трубу з Цэнтральнай Азіі ў абыход Расіі. Кіраўніцтва Чэхіі заявіла, што газаправод «Набука» будзе збудаваны не пазней за 2015 год.

**МБ**

## Вось так вось, злеганца

**Экс-намеснік міністра энергетыкі Расіі ўскладае віну за газавы крызіс на «Газпром».**

Пра гэта былы намеснік міністра энергетыкі Расіі Уладзімір Мілоў заявіў у эфіры радыёстанцыі «Эхо Москвы».

Мілоў мяркуе, што «Газпрому» не след было даходзіць да крайнасці — адключаць газ Украіне. На ягоную думку, Расія ад таго церпіць вялікія страты.

«Гэта недзе 150 мільёнаў даляраў на дзень... І вось так вось, злеганца, падыходзіць і адключаць на раз газавыя пастаўкі ў выпадку, калі там узніклі нейкія непамоўныя складанасці...» — здзіўляецца эксперт, які бачыць у гэтым канфлікце «выразны палітычны падтэкст».

На думку Мілова, інфармацыя, што распаўсюджваецца ў Расіі пра тое, што пасярэдніцкія структуры былі ўведзеныя ў газавыя адносіны нібыта з ініцыятывы Украіны, — няпраўда.

«На самай справе, тры гады таму прапанову пра ўвядзенне пасярэдніка «РосУкрЭнерга» вылучыў «Газпром», — заявіў ён.

**МБ**

# Маленне праваслаўнага актывіста

Калядны выступ Аляксандра Лукашэнкі каментуе **Аляксандр Класкоўскі**.

Выгляд і голас афіцыйнага кіраўніка наглядна ілюструюць, што крызіс не цётка. Ні пафасу, ні металу ў голасе.

Разам з тым — класічны «смажаны лёд» ягонага стылю — інерцыйная фраза, што ніякага крызісу ў краіне няма. Тут тэлеаб'ектыў паказальна праехаўся панарамай па тварах розных начальнікаў, што дружна прыйшлі на набажэнства. Гэта ім мэсідж: спуску не будзе!

Чалавек з іміджам усёмагутнага кіраўніка (не тое слова: фактычна дэміурга!) ды яшчэ з рэпутацыяй «праваслаўнага атэіста» ціхмяна апелюе да найвышэйшых сілаў: «Я думаю, што Госпад не абыдзе і гэтым разам клопатам нашу краіну, нашу дзяржаву, нашых людзей. Ва ўсякім разе, апошнія гады найноўшай гісторыі ён заўсёды нас падтрымліваў...».

Вось такое стоенае маленне. А калісь жа адзін вертыкальнік сказаў: вы трохі вышэйшы за Бога, і пярэчанняў нібыта не было... Крызіс унёс яснасць.

Увогуле ж абяцанне надалей казаць праўду («Мы не будзем вам хлусіць, і я найперш») прадракае новыя непапулярныя рашэнні (а куды дзявацца?). Звыш таго, гэта замаскаванае пасыпанне галавы попелам.

Дэвальвацыя, праведзеная ў стылі «оба-на!», стала каласальным іміджавым правалам кіроўнай вярхоўкі.

Рашэнне абрынуць сваю валюту адразу на 20%, магчыма, прымалася ў самы апошні момант. Паказальна, што не паспелі нават праінструктаваць падуладныя медыі, і першыя дні новага году яны былі проста ў ступары. Ды і потым выступы дробных сошак з запэўніваннямі, што ніякіх падстаў для росту цэнаў няма, выглядалі, мякка кажучы, вартымі жалю.

Тым часам насельніцтва размяло лядоўні ды тэлевізары, а прыватныя крамы памянялі цэтлікі па схеме +20%. Паказальна, што ў транспарце і крамах заступацца за прэзідэнта не адважваецца ніхто нават з цвёрдага электарату. Народ вызначыў дэвальвацыю па-народнаму: «кідалава».

Іншая рэч, што імпульс масам гэта надало не рэвалюцыйны, а хапальна-самаратавальны. Вясной варта чакаць масавага акопвання на сотках, вяртання ў парадыгму расліннага выжывання 1990-х.

# Маўчанне — знак...?

Палітолаг **Дзяніс Мельянцоў** пра палітычныя наступствы дэвальвацыі беларускага рубля.



Лідэры апазіцыі цягнулі з рэакцыяй на дэвальвацыю больш чым тыдзень.

PHOTO.BYMEDIA.NET

**«Наша Ніва»: Дэвальвацыя насамрэч была праведзена бліскуча, як кажа палітолаг Сіліцкі?**

**Дзяніс Мельянцоў:** Я схільны пагадзіцца з тымі эканамістамі, якія кажуць, што аднаразовая дэвальвацыя больш карысная для эканомікі, чым паўзучая. Пры паўзучай паніка была б большай, яна б выклікала большую інфляцыю і ўцёкі рублёвых дэпазітаў. А цяпер людзей пераконваюць, што больш падаць рубель не будзе і трэба проста прыстасоўвацца да таго, што ёсць.

**«НН»: Якія палітычныя вынікі для ўлады і апазіцыі будзе мець дэвальвацыя?**

**ДзМ:** Для ўлады гэта дэвальвацыя прывяла да змяншэння даверу. Лукашэнка і чынавенства напярэдадні клятвенна абяцалі, што ніякага змяншэння дабрабыту не будзе. Дэвальвацыя, безумоўна, мела сэнс для аздараўлення эканомікі, для спрыяння экспарту. Аднак у вачах звычайных выбарцаў такі рэзкі спад рубля ў разгар святаў стаўся шокам. Што да апазіцыі, то зноў пачалі з'яўляцца заявы асобных дзеячаў, што спее пратэставы настрой і калі сітуацыя будзе пагаршацца, то недзе вясной пачнуцца пратэсты. Мы бачым адраджэнне старой канцэпцыі, якім чынам апазіцыя можа прыйсці да ўлады — пагаршэнне эканамічнай сітуацыі і вулічныя акцыі. Другая высноўа: апазіцыя засведчыла сваю поўную рэакцыйнасць. Улады нешта робяць, а апазіцыя ў найлепшым выпадку спрабуе адказаць на гэтыя крокі. З дэвальвацыяй апазіцыя зноў праспала падзею, хоць аналітыкі яе прадказвалі.

**«НН»: Чым можна патлумачыць маўчанне апазіцыйных партый?**

**ДзМ:** Ладам жыцця саміх партыяў. Сённяшнія партыі — гэта не сілы, якія змагаюцца за ўладу. Гэта нейкая структура зваротнай сувязі з уладай. То бок, па дзеяннях апазіцыі ўлада можа меркаваць, якім чынам скарэктаваць сваю лінію паводзінаў. Апазіцыя займае сёння такое месца, якое не дазваляе ёй прыйсці да ўлады, але дазваляе прадстаўляць інтарэсы пэўнай часткі грамадства і ўскосным чынам карэктаваць дзеянні ўлады.

**«НН»: А ці не сведчыць гэтае маўчанне, што апазіцыя, магчыма, сёння згодная з афіцыйным курсам?**

**ДзМ:** Не. Апазіцыя на тое і апазіцыя. Проста апазіцыя не мае яснага бачання, што рабіць у дадзены момант. Чаму так сталася? Бо бракуе супрацоўніцтва апазіцыйнай супольнасці з экспертнай. Бо кадравы голад унутры партый.

**«НН»: Дык ці можна нам чакаць сацыяльных пратэстаў гэтай вясной?**

**ДзМ:** Не думаю.

**«НН»: Ці можна прагназаваць, што ў крызісных умовах улада нейкім чынам можа падзяліцца ўладай з прадстаўнікамі апазіцыі?**

**ДзМ:** Для гэтага няма падставаў. Улады не бачаць у апазіцыі сур'ёзнага палітычнага гульца. Апазіцыя так і не была ўключаная ў дыялог між уладай і Захадам.

**«НН»: А ўключэнне Раманчука і Вардамацкага ў міжведамасную групу па краінавым маркетынгу — гэта нейкая лакальная з'ява?**

**ДзМ:** Цяжка назваць сп.Вардамацкага палітычнай апазіцыяй. Што да прадстаўнікоў незалежнага грамадства, то там таксама ёсць людзі, якія ствараюць грамадскае меркаванне, тыя ж Раманчук і Вардамацкі. Гэта не крок насустрач апазіцыі. Хутчэй гэта спроба прадэманстраваць Захаду добрую волю ўладаў. Маўляў, глядзіце, мы ўлічваем розныя меркаванні. Гэта хутчэй прапагандысцкі крок. Паглядзім, ці будзе ўлічвацца меркаванне гэтых людзей пры прыняцці пэўных рашэнняў. Калі так, то мы зможам гаварыць, што ўлада зацікаўленая ў незалежных кансультантах, якія будуць нейкім чынам карэктаваць палітыку ўлады.

**«НН»: Вы кажаце, у сённяшніх умовах апазіцыя не высоўвае ніякіх патрабаванняў. А што за патрабаванні могуць быць?**

**ДзМ:** Абсалютна розныя. Трэба вылучыць альтэрнатыўны план выхаду з крызісу. Дэвальвацыя ж не адзіны метад паляпшэння эканамічнай сітуацыі. Іншым метадам можа быць скарачэнне розных дзяржаўных выдаткаў. Натуральным пасылам было б захаванне дабрабыту грамадзян. Для правых — патрабаванне выступаць з больш жорсткіх пазіцый у перамовах з Расіяй па газе. Ёсць шмат магчымасцей для давядзення сваіх думак. Але думкі павінны быць.

**«НН»: У час грузінска-расійскага канфлікту Вы пісалі, што апазіцыя мусіць суцішыць свае амбіцыі, а прызнанне рэжыму Лукашэнкі Еўропай прынясе карысць для нацыі. А цяпер Вы кажаце, што апазіцыя расчароўвае бяздзейнасцю. Хіба так многа памянялася?**

**ДзМ:** Я б не параўноўваў гэтыя сітуацыі. Калі ўзгадаць праблему геапалітычнага месца Беларусі, то для нас вельмі важная празаходняя арыентацыя краіны. І дзеянні ўраду добра супалі з нацыянальнымі інтарэсамі. Калі ж мы гаворым пра крызіс, то гэта сітуацыя ўнутрыпалітычнага і ўнутрыэканамічнага курсу. І мы яго з поўным правам можам разглядаць як правільны або як няправільны. Апазіцыя ў дадзенай сітуацыі павінна прэзентаваць альтэрнатыўнае бачанне, калі яна апазіцыя.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

**Дзяніс Мельянцоў**

палітолаг, аналітык Беларускага інстытуту стратэгічных даследаванняў, выкладчык ЕГУ.



PHOTO.BYMEDIA.NET

# У мінусе

Золатавалютныя запасы скараціліся за снежань нават мацней, чым паведамляў Белстат.

Нацбанк скарэктаваў раней абвешчаныя лічбы. Рэзервы скараціліся за снежань на $714,3 млн (18,4%), а не на $582,6 млн (15,4%), як паведамлялася раней. На 1 студзеня 2009 году яны склалі $3061,1 млн проці $4182,2 млн на 1 студзеня 2008 году.

Усяго за мінулы год ЗВР Беларусі зменшыліся на $1121,1 млн (26,8%).

**Мікола Бугай**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Мілінкевіч: Дэвальвацыя была праведзеная запозна

**«Наша Ніва»: Як Вы ацэньваеце праведзеную дэвальвацыю?**

**Аляксандр Мілінкевіч:** У выніку запозненага прынятага рашэння страчана вялікая частка золатавалютных рэзерваў краіны, шмат страцілі нашы экспарцёры, і, да таго ж, падарваны давер насельніцтва не толькі да сённяшняй кіроўнай групоўкі, але і да дзяржаўных інстытутаў Беларусі. Гэта ставіць пад пагрозу незалежнасць нашай дзяржавы.

Усё залежыць ад наступных дзеянняў беларускіх уладаў. Неабходна зрабіць рэальныя крокі па лібералізацыі эканомікі, структурных рэформах, прыватызацыі прадпрыемстваў, прычым не толькі прамысловых, але і транспартных, жыллёва-камунальных і іншых.

**Запісаў**
**Зміцер Панкавец**

# Краіна нерэлігійных людзей



PHOTO.BYMEDIA.NET

Усяго 140 тысяч чалавек прыйшлі ў храмы ў ноч на праваслаўнае і 90 тысяч — на каталіцкае Раство.

Каля 16 тыс. мінчукоў узялі ўдзел у багаслужбах на праваслаўнае Раство. Пра гэта БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе Мінгарвыканкаму. А ўсяго ў Беларусі — 140 тыс. Урачыстыя службы 6—7 студзеня прайшлі ў 25 храмах сталіцы.

Нагадаем, што ў службах на каталіцкае Божае нараджэнне 25 снежня ўзялі ўдзел 3 тыс. 300 чалавек у сталіцы і 90 тысяч чалавек ва ўсёй краіне.

Як бачым, Беларусь застаецца нерэлігійнай краінай.

**АГ**

# Дзве жанчыны кінуліся пад цягнік

4 і 5 студзеня пад Баранавічамі здарыліся дзве падобныя трагедыі.

Паводле сведчанняў відавочцаў, зрабілі гэта яны добраахвотна.

Першая трагедыя здарылася ў нядзелю 4 студзеня прыблізна а 8-й гадзіне раніцы на чыгуначным участку Пагарэльцы—Гарадзея, паведамляе баранавіцкая газета Intex-press. Паводле супрацоўнікаў транспартнай міліцыі, машыніст цягніка № 132 «Брэст—Масква» заўважыў чалавека, што ляжаў на рэйках. На папераджальныя сігналы чалавек не рэагаваў. Экстраннае спыненне цягніка, на жаль, не прадухіліла трагедыі — 54-гадовая жыхарка Баранавічаў загінула.

Следства схіляецца да версіі самагубства, бо са словаў родных жанчыны, апошнім часам яна паводзіла сябе неадэкватна.

На наступны дзень у 19.35 у дзяжурны аддзел Баранавіцкай транспартнай міліцыі паступіла новае паведамленне пра смерць на чыгунцы. Каля прыпынач-



нага пункту «Лакаматыўнае дэпо» пад коламі цягніка №111 «Мінск—Брэст» загінула жыхарка Баранавічаў, 1960 г.н. Са словаў сведак і машыніста, жанчына сама кінулася пад цягнік.

**Паводле Intex-press**

# Узнагарода знайшла гераіню

Лукашэнка ўганараваў журналістку Інгу Хрушчову.

За шматгадовую плённую працу, дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў, прафесійнае майстэрства, значны ўнёсак у развіццё паліўна-энергетычнага комплексу, заслугі ў развіцці адукацыі, аховы здароўя, культуры Аляксандр Лукашэнка сваім указам узнагародзіў 51 грамадзяніна краіны.

Ордэна Айчыны II ступені ўдастоены першы намеснік міністра энергетыкі Эдуард Таўпянец і галоўны навуковы супрацоўнік лабараторыі траўматычных пашкоджанняў пазваночніка і спіннога мозгу Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтру траўматалогіі і артапедыі Іосіф Варановіч.

Сярод узнагароджаных медалём «За працоўныя заслугі» аказалася і кіраўніца групы аддзелу палітычных аглядальнікаў агенцтва тэлевізійных навін Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Інга Хрушчова, паведамляе БЕЛТА.

**МБ**

## СЦІСЛА

### Беларусбанк прыпыніў выдачу крэдытаў на аўтамабілі

Беларусбанк прыпыніў выдачу крэдытаў на аўтамабілі, а астатнія крэдыты,у тым ліку на мотатэхніку, будаўніцтва жылля, адпачынак выдаюцца ў рублях. Абсалютбанк часова прыпыніў спажывецкае крэдытаванне.

Банк «Масква—Мінск» прыпыніў выдачу крэдытных картак у валюце, карткі выдаюцца толькі ў рублях, ліміт да 4,5 млн.

### Піва праз інтэрнэт

У Беларусі забароняць рознічны гандаль півам праз інтэрнэт. Як паведаміла прэс-служба ўраду, такое рашэнне ёсць у пастанове Саўміну ад 30 снежня 2008 г. Узнікае пытанне — няўжо ж такое практыкавалася?

### Мірон падтрымаў украінцаў

Бел-чырвона-белы сцяг залунаў на праваслаўнае Раство ў Віцебску. Яго вывесілі на даху пяціпавярховага дому №1 па вуліцы Леніна, побач з плошчай Перамогі. Да сцяга была прымацавана цыдулка: «На знак салідарнасці з братнім украінскім народам у гэты цяжкі для яго час. Мірон».

### Дзевяцікласнікі абрабавалі дырэктара

У Бешанковіцкім раёне школьнікі абрабавалі сейф дырэктара школы. Падабралі ключ да дзвярэй кабінета, а сейф стаяў незамкнёны. Выцягнулі 800 тыс. рублёў. Хлопцы стаяць на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх і ўжо маюць судзімасці за крадзяжы.

Цяпер ім пагражае да 7 гадоў турмы.

### Крызіс дабраўся і да Google

Найбуйнейшы інтэрнэт-пошукавік Google звольніў большую частку сваіх супрацоўнікаў. Зроблена гэта ў сувязі са складанай эканамічнай сітуацыяй у ЗША. У кастрычніку на Google працавалі больш за 10 тыс. пазаштатнікаў, цяпер толькі 4300.

Акцыі Google абваліліся на 55%.

### Пушча, Дняпро і Нарач могуць увайсці ў спіс сямі цудаў прыроды

У інтэрнэце пачалося галасаванне па выбары сямі цудаў прыроды Еўропы. Усяго адабраны 261 прэтэндэнт. Сярод іх тры маюць непасрэднае дачыненне да Беларусі — Белавежская пушча, рака Дняпро і возера Нарач.

**МБ, ЗП; паводле радыё «Свабода», infobank.by, «Эхо Москвы», БЕЛТА**

# Гэтае салодкае слова...

**Апошнім разам падобнае ўзбагачэнне палітычнай лексікі адбылося акурат чвэрць стагоддзя таму ў СССР. Тады замест рэформаў абвяшчалася перабудова, замест свабоды — галоснасць, замест дэмакратыі — дэмакратызацыя. Чым адрозніваецца дэмакратызацыя ад сапраўднай дэмакратыі, народ, праўда, зразумеў даволі хутка. Нездарма пасля разгону мірнага шэсця ў Курапаты міліцэйскія дубінкі людзі пачалі называць «дэмакратызатарамі». А што азначае ў сённяшняй Беларусі «лібералізацыя»? Піша Віталь Тарас.**

### Ад генералісімуса да лібералісімуса

Перш чым спрабаваць расшыфраваць сэнс гэтага «каляднага паслання» ўладаў народу, варта ўспомніць, што азначае тэрмін «лібералізм» і што за ім стаіць. Паходзіць ён ад лацінскага слова «liber» (вольны). У Расію слова «ліберальны» прыйшло з захаду ў XVIII стагоддзі і спачатку азначала «вальнадумны». Пазней яно набыло негатыўнае адценне. Сатырык Салтыкоў-Шчадрын прысвяціў нямала ядавітых радкоў расійскім«лібералам». Дастаткова ўспомніць «Мудрага печкура». Герой апавядання выступіў перад шчупаком з палымянай ліберальнай прамовай і быў імгненна ім праглынуты. Проста таму, што драпежная рыбіна развявіла сківіцы ад здзіўлення, і печкура плынню ўцягнула ўнутр.

Іншы расійскі сатырык — Уладзімір Вайновіч — у сваім рамане «Масква 2042» вывеў персанаж пад імем Геніялісімус. Гэта маршал КДБ Букашоў, якога за заслугі перад айчынай узнагаралі найвышэйшым званнем «Геніялісімуса» і запусцілі на арбіту ў космас, адкуль ён кіраваў з дапамогай указаў Маскарэпай. Так, паводле аўтара, называецца будучая дзяржава.

Пры канцы 1990-х у прэсе з'явілася іранічная мянушка Лібералісімус (яўна падказаная раманам Вайновіча). Так будуць называць, напрыклад, Жырыноўскага, лідэра першай з дазволеных Крамлём партыяў — ЛДПР. Пазней некаторыя апазіцыйныя публіцысты пачнуць ужываць слова «лібералісімус» і ў дачыненні да кіраўніка РБ.

Але мянушка гэтая ў Беларусі не прыжылася. І не толькі таму, што, адрозна ад прыдуманага Геніялісімуса, ад якога, паводле раману, рэальна нічога не залежала, наш кіраўнік сапраўды кіруе ўсім жыццём дзяржавы, нават у дробязях.

Жарты на тэму лібералізму выглядаюць нясмешна, бо ў нас, яшчэ ў большай ступені, чым у Расіі, на дзяржаўным узроўні падтрымліваецца культ Генералісімуса — Іосіфа Сталіна.

Дарэчы, вынікі тэлепраекту Першага каналу «Імя Расіі», паводле якіх Сталін заняў трэцяе месца ў галасаванні, не такія бяскрыўдныя, як можа падацца. Калі ўважліва прыглядзецца, дык пераможца галасавання Аляксандр Неўскі ёсць свайго роду двайніком Сталіна. У масавай свядомасці князь Аляксандр Неўскі — гэта герой аднайменнага фільму Сяргея Эйзенштэйна. Фільм, як вядома, быў зроблены напярэдадні вайны на заказ генсека. Савецкі рэжысёр, фактычна, вывеў у ім аблічча кінагероя. Гэта Сталін у ідэальным варыянце — увасоблены ў непахісным ваяры з мячом у руцэ і біблейскім прароцтвам на вуснах: «Хто з мячом да нас прыйдзе, той ад мяча і загіне!» Галоўнае зло герой кінакарціны бачыць не ў татарскай Ардзе, якой вымушаны плаціць даніну, а на Захадзе, адкуль ідуць на праваслаўную Русь ненавісныя крыжаносцы-каталікі.



Лібералізацыя ў дзеянні нагадвае несмяротныя творы Салтыкова-Шчадрына.

А паміж сярэднявечным князем і Сталіным зацясаўся Сталыпін, якога памятаюць у народзе дзякуючы «сталыпінскім гальштукам» (ён увёў у Расіі інстытут паскораных ваенна-палявых судоў, якія канчаліся шыбеніцай).

### Ці быў Каліноўскі лібералам?

Можна доўга разважаць над гісторыяй ліберальнай ідэі ды крушэннем лібералізму ў Расіі 1990-х. Але ж у гісторыі Беларусі ўвогуле не было і няма рэальных прататыпаў дзеячаў ліберальнай ідэі. Славутае liberum veto — права любога шляхціча заблакаваць любое рашэнне Сойму, не мае дачынення да лібералізму, хутчэй — да анархіі.

Цяжка знайсці ліберальных герояў і ў нашай літаратуры. Даводзілася, праўда, сустракацца з меркаваннем, што Кастусь Каліноўскі быў ліберальным дзеячам, паколькі змагаўся за свабоду — у тым ліку за свабоду беларускага слова. Але свабода друку ёсць усяго толькі адным з складнікаў заходняга лібералізму, які не толькі абвясціў правы чалавека на свабоду і свабоднае прадпрымальніцтва. Ён мае карані ў ідэалах гуманізму. Дарэчы, лібералы напачатку не прымалі дэмакратыі. Яны лічылі, што сам чалавек лепей за ўсіх ведае, што для яго добра. І ніякія выбары ў прадстаўнічыя інстытуцыі яму не патрэбныя. Толькі пазней лібералы сталі выступаць за свабодныя выбары як усвядомленую неабходнасць.

Лідэра нацыянальна-вызвольнага руху Каліноўскага можна назваць дэмакратам, але ж ніяк не гуманістам і не лібералам. Час, калі ў Расіі панавалі зусім не лібералы, а такія асобы, як Мураўёў-вешальнік (папярэднік Сталыпіна?) гуманізму не спрыяў.

Сярод заснавальнікаў БНР пераважалі прыхільнікі сацыялістычнай ідэі, вельмі далёкай ад ліберальнай. Адзінае выключэнне — старшыня Белнацкаму Раман Скірмунт. Гісторыкі яго называюць то кансерватарам, то лібералам (што, насамрэч, ёсць двума бакамі аднаго медаля). Але ж смерць яго ў кастрычніку 1939 году ў сваім маёнтку ад рук сялян наўрад ці сведчыць пра поспех лібералізму ў Беларусі, ды і ва ўсёй перадваеннай Еўропе.

Цяпер Еўропа зусім не тая. У большасці краінаў ЕС ва ўладзе знаходзяцца калі не лібералы і не кансерватары, дык сацыялісты, якія часта з поспехам блакуюцца з сваімі ідэйнымі спаборнікамі. Асабліва, калі ўзнікае пагроза прыходу да ўлады крайне правых, ксенафобскіх партыяў, як гэта здарылася нядаўна, напрыклад, у Аўстрыі і Швейцарыі.

### Лінгвістычны аналіз

Ці ёсць абвяшчэнне лібералізацыі з высокай трыбуны крокам насустрач сучаснай Еўропе, яе дэмакратычным і ліберальным каштоўнасцям?

Варта звярнуць увагу на само лексічнае значэнне слова. Не лібералізм ці ліберальная ідэя, а — *лібералізацыя*. Да гэтага ў савецкай гісторыі былі «электрыфікацыя», «індустрыялізацыя», «калектывізацыя», «хімізацыя», нарэшце «дэмакратызацыя». Была і «лібералізацыя» — пры Хрушчову. Тады з сталінскіх лагераў выпусцілі мільёны палітзэкаў. Аднак пазней у Беларусі лібералізацыя вылілася ў паўсюднае закрыццё цэркваў і касцёлаў і ў выгнанне беларускай мовы з большасці школаў ды афіцыйных установаў.

Так што цяперашняя лібералізацыя цалкам упісваецца ў савецкі семантычны шэраг разнастайных «-цыяў», ніводная з якіх нічога не давала звычайным людзям — ні кілбасы, ні свабоды. Новыя лозунгі абвяшчаліся ўладамі заўсёды выключна для таго, каб засяміць, схаваць сэнс таго, што адбываецца на самай справе: замест рабскай працы — «індустрыялізацыя», замест прыгоннага права і голаду — «калектывізацыя», замест праўды пра сталінскія злачынствы — «лібералізацыя».

Падчас сустрэчы кіраўніка дзяржавы з кіраўнікамі дзяржаўных СМІ, на якой шмат гаварылася пра лібералізацыю, адзін з тэленачальнікаў згадаў пра «адно акно». Меўся на ўвазе прэзідэнцкі ўказ, паводле якога ўсе дакументы пры вырашэнні справаў можна было здаваць і атрымліваць праз адно акно, дзеля зручнасці і хуткасці. На справе гэта, канечне, вылілася ў яшчэ даўжэйшыя чэргі ва ўстановах. Кіраўнік дзяржавы не ведаў, відаць, што бюракратызм, нягледзячы на яго ўказ, па-ранейшаму працвітае. Таму ён даручыў праверыць агучаныя факты і, калі пацвердзяцца, сурова спагнаць з вінаватых. Гэта і ёсць лібералізацыя ў дзеянні. Хоць і нагадвае несмяротныя творы Салтыкова-Шчадрына.

Гэта не значыць, што не варта радавацца вызваленню палітзняволеных, вяртанню некаторых незалежных газет у шапікі, або рэгістрацыі Руху за Свабоду. Можна не толькі радавацца, але ж і паспрабаваць выкарыстаць новыя магчымасці ў практыцы, пакуль дзяржава зноў не памяняе правілы гульні. Толькі варта памятаць, што гэта менавіта гульня, гульня словаў.

Мы ведаем з нядаўняй гісторыі, што «галоснасць» і «дэмакратызацыя» маюць тэндэнцыю ператварацца ў нешта большае. Толькі гэтага трэба не чакаць ад улады, а дамагацца самім.

# А ў адказ цішыня

**Баранавіцкі Intex-press дагэтуль чакае адказу з «Белпошты». «Белсаюздрук» адмовіў выданню ў распаўсюдзе.**

«Мы паспрабавалі ўслед за «Народнай воляй» і «Нашай Нівай» звярнуцца ў арганізацыі распаўсюду, але вынік атрымаўся нулявы», — паведаміў галоўны рэдактар баранавіцкай газеты Intex-press Уладзімір Янукевіч. Паводле яго словаў, да вяртання ў шапікі двух незалежных выданняў у «Белсаюздруку» адмаўлялі на той падставе, што не бачаць у гэтым патрэбы, а пасля заявілі, што спіс выданняў, якія прадае прадпрыемства, ужо складзены. У баранавіцкім аддзяленні «Белпошты» сказалі, што такое пытанне вырашаецца на рэспубліканскім узроўні. З Мінску рэдакцыя найбуйнейшага рэгіянальнага выдання чакае адказу дагэтуль.

Газета Intex-press, а таксама іншыя рэгіянальныя выданні баранавіцкага выдавецкага дому даходзяць да чытача самастойна.

На сёння наклад папулярнага ў рэгіёне выдання складае каля 17 тысяч асобнікаў. Яго чытаюць у кожнай трэцяй хаце рэгіёну.

**Сямён Печанко**

# Тут будуць амалоджваць слуг народу

Новая бальніца Кіраўніцтва справаў прэзідэнта паўстане на рагу Энгельса і Ульянаўскай.

У цэнтры Мінску пачалося вялікае будаўніцтва. Тут, на месцы пусткі, старой прахадной і двух невялічкіх будынкаў прэзідэнцкай бальніцы на працягу наступных двух гадоў будуць пабудаваныя новыя дыягнастычны корпус і аперацыйны блок са стацыянарам. Лякарня стане тыповым узорам безаблічнага айчыннага хайтэку. Генеральнай праектнай арганізацыяй стаў інстытут «Мінскграмадзянпраект».

Заказчык: Кіраўніцтва справаў ППРБ

Кошт: 42 млрд рублёў (22 млрд — дыягнастычны корпус, 20 млрд — аперацыйны блок без уліку кошту медабсталявання).

Тэрміны пабудовы: 2009—2010 гг.

**Darriuss.livejournal.com**



Такім будзе віп-шпіталь. Дарэчы, сайт лечкамісіі ўжо месціцца на дамэне з цудоўнай назвай www.vip-clinic.by.

Расчышчаная прастора ў цэнтры гораду.



КАМЕНТАР

## Хранічна хворыя на паталагічную сквапнасць

Калісьці і ЦК, і Саўмін, і ўсякія заслужаныя дзеячы змяшчаліся ў некалькіх карпусах «лечкамісіі», і пры гэтым усе лічылі, што краінай кіруюць лядачыя старыя наменклатурнікі. Лечкамісія была бяльмом на воку, матэрыялізаваным увасабленнем прывілеяў. Менавіта на хвалі барацьбы з прывілеямі прыйшла да ўлады маладая каманда, ды вось дзівосы — так расхварэліся «маладыя ваўкі», што да ўжо наяўных карпусоў лечкамісіі ім спатрэбіўся і будынак дзіцячай палiклінікі, і памяшканні Інстытуту радыяцыйнай медыцыны. Цяпер вось яшчэ будуюць два велізарныя новыя корпусы. Прычым будуюць проці зімы, у перыяд вострага фінансавага крызісу. Усе сацыяльныя праграмы ўразаюцца, але нішто не перашкодзіла чыноўнікам разбухаць мегабудоўлю бальніцы для саміх сябе.

А калі падумаць, то выходзіць нейкі абсурд! То яны ўсе павальна ў хакей гуляюць і па прэзідэнцкім свістку на лыжах кросы шпараць, то ў клініках сваіх змясціцца не могуць... Ці яны проста з кросу — да дактароў бягуць?! Дык, панове, для дзяржавы гэтыя вашыя забегі задорага абыходзяцца.

Як я разумею: хворыя — лячыцеся і не займайце высокааплатныя месцы. І лепей лячыцеся ў звычайных гарадскіх бальніцах.

**Святлана Калінкіна, «Беларускі партызан»**

# Гей? У войска?

Першы раз у гісторыі Беларусі чалавека не камісавалі за адкрытую гомасексуальнасць. Далі адтэрміноўку.



Мазырскі ваенны камісарыят прыняў рашэнне пра тое, што рэдактар беларускага сайту для геяў і лесбіянак GayBy Аляксандр Палуян пакуль не будзе прызваны на тэрміновую службу ў беларускае войска. Але такое права за прызыўніком, які адкрыта заявіў пра сваю гомасексуальнасць, застаецца.

Раней у такіх выпадках звычайна ставіўся псіхіятрычны дыягназ, які рабіў чалавека нягодным да вайсковай службы. Але Палуян сам не захацеў мець «белы білет» і прасіў менавіта адтэрміноўку. І ваенкамат пайшоў насустрач. Паставіцца з увагай да выпадку 23-гадовага вайсковаабавязанага гея супрацоўнікаў ваенкамату змусіў той розгалас, які атрымала гісторыя ў беларускіх і замежных сродках масавай інфармацыі. Паспрыялі і звароты сяброў Беларускай ініцыятывы за сексуальнае і гендэрнае раўнапраўе ў Мазырскі гарвыканкам — з заяўкай на пікет ля ваенкамату, і ў Міністэрства абароны — з просьбай пачаць праводзіць шырокую антыгамафобную прапаганду ў беларускім войску.

Сусветны рух геяў дабіваецца, каб да людзей з іншай сексуальнай арыентацыяй ставіліся як да іншых грамадзянаў. Каб яны мелі ўсе тыя самыя правы і абавязкі і не змушаныя былі хаваць сваю арыентацыю. Правы для геяў служыць у арміі было тэмай для дыскусій у многіх краінах свету, у тым ліку ЗША. На думку некаторых вайскоўцаў, прысутнасць геяў у войску можа весці да канфліктных сітуацый. Праваабаронцы лічаць, што справа толькі ў выхаванні цярпімасці.

**МБ**

# Вандалізм у Курапатах: следчым доказаў мала

Бараўлянскім аддзелам Мінскага РУУС спынены крымінальны пераслед двух маладых людзей, падазраваных у знішчэнні памятных крыжоў.

Начальнік следства Бараўлянскага аддзелу Мінскага РУУС Ігар Барадач зазначыў, што доказаў, атрыманых падчас расследавання, недастаткова для перадачы справы ў суд і прыцягнення да крымінальнай адказнасці двух непаўналетніх мінчан — навучэнцаў школы і прафтэхвучылішча.

Разам з тым, паведаміў І.Барадач, працягваецца расследаванне крымінальнай справы па факце знішчэння памятных крыжоў у Курапатах. Паводле яго словаў, будуць прымацца меры па ўстанаўленні асоб, якія ўчынілі гэтае злачынства.

1 лістапада прыблізна ў 22.00 нацыянальныя актывісты з Мінску Аляксандр Макаў і Алег Свірыдаў затрымалі ў Курапатах двух маладых людзей. Яны былі ў нецвярозым стане і ламалі памятныя крыжы на алеі, што вядзе ад Крыжа пакутаў да ўзгорку з мемарыяльным каменем ахвярам сталінізму. Адзін з затрыманых па мабільным тэлефоне выклікаў бацькоў і заявіў, што хутка прыедзе яго бацька, пакажа сваю «корачку» (пасведчанне асобы) і вызваліць юнакоў. Аднак бацька, насуперак абяцанням затрыманага, нічога не сказаў А.Макаву і А.Свірыдаву ні ва ўрочышчы, ні ў Бараўлянскім аддзеле Мінскага РУУС, куды іх даставілі разам з затрыманымі.

За апошнія тры гады па фактах вандалізму ў Курапатах, з 1993 году ўнесеных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі як помнік гісторыі міжнароднага значэння «Месца знішчэння ахвяраў палітычных рэпрэсій», трэці раз распачынаецца крымінальная справа. Аднак вандалаў удалося затрымаць упершыню, прычым прадстаўнікам грамадскасці, а не міліцыі.

**БелаПАН**

# Іван Шыла ідзе служыць

Пойдзе ў армію юнак, якому не далі атэстату за палітыку.


ЗМІЦЕР ПАНКАВЕЦ

Медычная камісія 12 студзеня прыняла рашэнне, што Іван Шыла з Салігорску прыдатны для праходжання вайсковай службы. Шыла набыў вядомасць як адзін з лідэраў Маладога фронту. Яго судзілі, арыштоўвалі, а калі пабачылі, што штрафамі не запалохаць, выгналі з школы ў час выпускных экзаменаў у чэрвені 2008 году.

«Я да апошняга не хацеў афішаваць справу з маім прызывам, бо сумняваўся, ці ёсць тут палітычны чыннік. Але ў панядзелак, калі выходзіў з пад'езду, каб пайсці ў ваенкамат, мяне затрымалі супрацоўнікі міліцыі і самі адвезлі туды. Доўгі час канчатковае рашэнне аб тым, ці пайду я ў войска, тармазілася рашэннем псіхолага. Там, у ваенкамаце, сядзіць маладзенькая дзяўчына, якая глянула на маю біяграфію, дзе ёсць крымінальная судзімасць, звыш васьмідзесяці затрыманняў і некалькі мільёнаў штрафу, здзівілася: а такіх бяруць у войска?» — кажа І.Шыла.

Адразу па прывозе Івана ў ваенкамаце прайшла камісія ў складзе галоўнага доктара раённай бальніцы, лекара з Мінску, двух прадстаўнікоў ваенкамату. Паводле Івана, на паседжанні прысутнічаў супрацоўнік КДБ, які курыруе салігорскую апазіцыю. Менавіта ён даваў нейкія парады ваенкаму. Таксама прысутнічала здымачная група БТ.

У выніку камісія прыняла рашэнне, што Шыла можа праходзіць тэрміновую службу. Ніякіх перашкод па здароўі ў яго няма. 15 студзеня хлопец мусіць з'явіцца на прызыўную камісію. Найхутчэй, тады і стане вядома, дзе будзе служыць адзін з лідэраў Маладога фронту. Іван прагназуе, што яго павінны забраць «у боты» да 18 студзеня.

«Забіраючы у войска, мяне пазбаўляюць магчымасці атрымаць дыплом аб сярэдняй адукацыі не на паўтара году, а на два з паловай. А для мяне зараз галоўнае акурат атрыманне адукацыі», — трохі шкадуе І.Шыла. Праз неатрыманне дыплому хлопец не змог паступіць на вучобу ў ВНУ.

Але служыць пойдзе: «Закон ёсць закон, я не хачу яго парушаць і аспрэчваць, але я б хацеў, каб ён быў роўны для ўсіх».

Прызыў у войска дэмакратычных актывістаў, якім з палітычных матываў перашкодзілі працягваць адукацыю, набывае масавы характар.

Першым быў выпадак адлічанага з універсітэту Змітра Жалезнічэнкі. Следам прызвалі актывіста Алеся Каліту, прыйшла павестка таксама адлічанаму з ВНУ Франаку Вячорку

**Зміцер Панкавец**



# Першы раз

19–гадовая **Вікторыя Азаранка** выйграла першы турнір у кар'еры паводле WTA (Жаночай тэніснай асацыяцыі).

Яна перамагла на турніры ў аўстралійскім Брысбене (прызавы фонд — 220 тыс. даляраў). У суботу ў фінале беларуска абыграла францужанку Марыён Барталі — 6:3, 6:1.

Беларуска — 16-я ракетка свету, француженка — 17-я. Азаранка была пасеяна на турніры 2-й, Барталі — 3-й. Першая пасеяная — Анна Іванавіч — выбыла ў чвэрцьфінале.

Беларуска да гэтага чатыры разы гуляла ў фінале турніраў адзіночнага разраду, але штораз прайгравала.

Азаранка выйграла адзін турнір у парным разрадзе. Было тое ў Ташкенце ў 2006 г. (разам з Тацянай Пучак), двойчы таксама перамагла ў міксце.

**АГ**

# Чэмпіён выпаў з акна

## Загадкавая смерць 22-гадовага вадналыжніка

У пятніцу з 12-га паверху будынку інтэрнату Рэспубліканскай вучэльні алімпійскага рэзерву, што знаходзіцца ў Мінску на вуліцы Каліноўскага, 111б, вываліўся удзельнік нацыянальнай зборнай па вадналыжным спорце, майстар спорту міжнароднага класу Дзмітры Аксіневіч.

22-гадовы спартовец разбіўся да смерці.

Ніхто не бачыў, як і калі Дзмітры заходзіў у інтэрнат. Выйсце на дах было замкнёнае.

Прычыны трагедыі расследуе пракуратура Першамайскага раёну сталіцы. Пакуль працоўнае версія — самагубства.

**АГ**


**Як і ўсе спартоўцы свайго віду, Аксіневіч быў чалавекам адчайным і жыццярадасным.**

## Якія людзі добрыя

Хачу праз вашу добрую газету падзякаваць правадніцам цягніка Гродна—Мінск.

Вяртаючыся ў сталіцу ад мамы з Новага году, забылася ў купэ партманэ з парадачнай сумай грошай (ліха бяры тую дэвальвацыю). І толькі на наступны дзень уранку спахапілася. Думала, прыйдзецца пазычаць на месяц. Аднак стала ўспамінаць... і паехала на вакзал. А там праз брыгаду цягніка знайшла сваіх праваднiц. І яны вярнулі мне ўсё. Як добрая дурніца, я ж не мела ў партманэ аніякага свайго адрасу.

Не буду называць прозвішчаў. Няхай добрыя словы лятуць на адрас усіх работніц (і работнікаў) чыгункі.

**Яніна Бялькевіч, Мінск**

## Няўжо так у кожным горадзе?

Як прыязджаў Лукашэнка на хакей у Бярозу, у нас увесь гарадок стаяў на вушах.

У нядзелю КДБ апламбавала гарышчы прыватнага сектару, да гэтага — шматпавярховікаў. Напярэдадні пробную паездку рабіў прэзідэнцкі картэж. Аблвыканкам зацвердзіў спісы гледачоў у новым лядовым палацы. Загадалі ім прыйсці на некалькі гадзін раней за пачатак хакею і пры сабе мець пашпарты. Гледачоў пастаўляюць прадпрыемствы з ліку добранадзейных. Два дні ляталі МІГі з блізкай авіябазы. Многа чаго іншага...

**-але-, Бяроза (Брэсцкая вобласць)**

## Фізкультура, даведзеная да абсурду

**Даўні падлік экспертаў ЮНЕСКА, што «1 даляр, укладзены ў *фізкультуру*, эканоміць *3,2* даляра медыцынскіх выдаткаў», нашы спартыўныя чыноўнікі нахабна «ўдасканалілі» і цэлы год нам укладалі ў вушы: «1 даляр, укладзены ў *спорт*, эканоміць *5* даляраў медыцынскіх выдаткаў».** Дзве маленькія розніцы прыкмецілі? Вось жа, краіна найлепшай у свеце прапаганды!

Неабходную для ўсіх фізкультуру (як і культуру наогул)ператварылі ў суцэльны спорт. А нейкіх прыкметных зрухаў у паляпшэнні здароўя нашага народу як не было, так і няма. Напэўна, таму, што, як крыху раней жыхар Оршы А.Дзяруга ў «АіФе» вызначыў: «спорт — гэта фізкультура, даведзеная да абсурду».

**Генадзь Шэршань, Мінск**

## Не дапамагла і «Слава Сталіну!»

**Паабапал бальшака, што вядзе з Полацку ў Асвею, насупраць маёй вёскі Уладычына, растуць вішні і слівы.** Так што можна ўлетку паласавацца сакаўнымі пладамі. Не бойцеся загазаванасці. Папершае, гэтая дарога не вызначаецца інтэнсіўным рухам машын. А па-другое, пладовыя дрэўцы адгароджаныя ад шашы алешнікам ды асіннікам. Так распарадзілася прырода.

Гэтыя вішні і слівы — нашчадкі тых дрэўцаў, якія тры чвэрці стагоддзя таму тут пасадзіў мой аднавясковец, дарожны майстар Ціт Вутачкін.

Дбайна даглядаў ён бальшак. На брукоўцы — ніводнай выбоіны. Абапал таксама парадак. На высокіх адхонах — выкладзеныя каменьчыкамі словы «Слава Сталіну!». Пафарбаваныя крэйдай, яны на травяным фоне вылучаліся сваёй белізной.

Нічога, здаецца, не прадказвала бяды! А яна прыйшла раптоўна. Быў самы пік сталінскіх рэпрэсій. У адну з начэй да Цітавай хаты пад'ехаў «варанок». Дарожнага майстра арыштавалі і павезлі ў цемру. Чалавек знік назаўсёды.

Не дапамаглі яму выжыць ні шчырая служба на дарозе, ні пасланае ў Маскву калектыўнае пісьмо аднавяскоўцаў у абарону свайго земляка.

**Мікола Бадзюкоў, Полацк**

## Ані з Польшчай, ані з Расіяй

**Супярэчлівыя пачуцці выклікаў у мяне артыкул Алы Петрушкевіч «Расстрэл у гонар Першамаю» («НН» за 11 снежня 2008).** На першы погляд, гэта аповед пра тое, як у гады вайны ў Заходняй Беларусі партызаны вынішчылі інтэлігентную панскую сям'ю. Але, калі разабрацца, то артыкул гэты — пра тое, як на тэрыторыі Беларусі рускія (і тыя беларусы, якія з імі хаўруснічалі) вынішчылі палякаў (бо, хутчэй за ўсё, сям'я Чарноўскіх была носьбітам польскага нацыянальнага духу).

> Можна прывесці і адваротныя прыклады: як палякі вынішчалі беларусаў у Беларусі.

Але можна прывесці і адваротныя прыклады: як палякі вынішчалі беларусаў на тэрыторыі Беларусі. Сустракала ў літаратуры апісанне не меней жахлівых эпізодаў, як у гады вайны польская партызанская Армія Краёва вынішчала сем'і праваслаўных святароў. Пры гэтым таксама жыўцом палілі.

Армія Краёва ў пасляваенны час развязала сапраўдны тэрор супраць беларускага насельніцтва, якое апынулася на тэрыторыі Польшчы паводле новай савецка-польскай мяжы. Расстрэльвалі толькі за тое, што чалавек называўся беларусам. А для сённяшняй Польшчы акаўцы — героі.

Людзей, ведама, шкада і тых і тых, але сказаць хацелася пра іншае. Гэтыя эпізоды яскрава адлюстроўваюць геапалітычную сітуацыю, якая існуе на беларускіх землях ужо некалькі стагоддзяў: за беларускую тэрыторыю змагаюцца між сабою палякі і расійцы, і пры гэтым гатовыя люта вынішчаць на гэтай тэрыторыі адны другіх. Нянавісць, якую маюць адзін да аднаго гэтыя два народы і якая прарываецца ў палітычных адносінах і сёння, выклікана тым, што яны прагна прэтэндуюць на адзін і той жа аб'ект — Беларусь.

Што ў гэтай сітуацыі рабіць беларусам? Напэўна, дыстанцыявацца і ад тых, і ад тых і абараняць уласныя нацыянальныя інтарэсы.

Я пішу гэта для таго, каб паказаць: Польшча — не шчыры сябар Беларусі. Калі і аказваецца падтрымка беларускаму руху, то з надзеяй, што калі-небудзь, паступова, беларусы апалячацца. Вось і паспяховы прыклад ужо ёсць: польскія беларусы ўжо называюць сябе пры перапісах насельніцтва праваслаўнымі палякамі.

На жаль, «Наша Ніва» салідарызуецца з палякамі. А чым палякі лепшыя за расійцаў, скажыце, калі ласка? Адны русіфікавалі, другія паланізавалі, а якая розніца? Беларушчыне не давалі развівацца ні тыя, ні тыя, нават палякі тут дзейнічалі больш напорыста.

**Тацяна Шаклач, Мінск**

**Ад Рэдакцыі.** З першай часткай Вашага ліста згодныя, з другой — не. Польшча цяпер не тая, што была. Дый Беларусь не тая. Вы накладаеце старыя гістарычныя крыўды на сённяшні час. А Польшчу змянілі «Салідарнасць» і далучэнне да Еўрасаюзу. Яшчэ 50 гадоў таму інтэлектуалы з асяродку польскага эміграцыйнага часопісу Kultura сфармулявалі, што ў нацыянальных інтарэсах Польшчы — захаванне стабільных межаў і ўмацаванне незалежнасці Беларусі і Украіны. Гэтай канцэпцыяй і кіруецца цяпер новая польская дыпламатыя. «Паланізацыя Беларусі» — нешта з шэрагу нерэальнага сёння. Польскае грамадства шчыра жадае свабодаў і незалежнасці для Беларусі. Напрыклад, палітычныя перамены ва Украіне не прывялі да апалячвання. Наадварот. Менавіта супрацоўніцтва Беларусі, Украіны, Польшчы, Літвы і іншых краінаў Міжмор'я даюць Беларусі шанец на эканамічную і ваенную бяспеку і спакойнае развіццё да таго часу, пакуль сённяшняя імперская Расія не распадзецца на дэмакратычныя дзяржавы. Дарэчы, і лукашэнкаўская групоўка тое пачала разумець. Што да «НН», то яна разлічаная на ўсіх грамадзянаў РБ, незалежна ад нацыянальнасці, веравызнання, на ўсіх, а не толькі на беларусаў. Мы адна нацыя, што складаецца з людзей рознага паходжання.

## АЭС, пра якую нам не кажуць

**Калі пачаліся размовы аб будаўніцтве ў Беларусі АЭС і з'явіліся прапановы будаўнічых пляцовак, з жахам убачыў сярод іх адну — Астравецкую.** Сэрца адчувала, што выбар спыніцца менавіта на ёй, бо яна знаходзіцца блізка да Літвы. На мой погляд, у гэтым выбары ёсць затоены палітычны намер. І ён прыкры.

Аднак маё непрыманне такой ідэі звязана найперш з экалогіяй.

Астравеччына пры ўсёй яе някідкай, спакойнай прыгажосці сапраўды зачароўвае разнастайнасцю, зменлівасцю краявідаў і здзіўляе шмат якімі з'явамі прыроды. На поўдні пралеглі адгор'і Ашмянскага ўзвышша. Далей на поўнач ідзе Нарачанска-Вілейская нізіна, прарэзаная катлавінамі азёр. Шматлікія азёры распасціраюць свае воды сярод лясістых узгоркаў, пасярод зялёных лугоў, над блакітнай Вяллёй. У далінах рэк багата тарфянікаў і ройстаў — балот, парослых багуном і журавіннікам. Далей на поўнач пачынаюцца сасновыя бары, ператканыя бярозаю, елкаю, асінаю і ляшчыннікам. Лясы, якія захаваліся, яшчэ цудоўныя, глыбокія, таямнічыя, поўныя вільготных водараў і ціхага шэпту. Найпрыгажэйшая Вялля гулліва віецца ў шырокіх і павольных паваротах, месцамі сярод лесу або падплываючы да лугу, а стромкія яе берагі ствараюць маляўнічую панараму для плынных водаў. Зноў немаведама адкуль бяруцца пасмы ўзгоркаў, а сярод іх раптам выблісне азёрнае вока Падкасцёлка ці Падліп'я. На поўначы, дзе на Сарачанку нанізана Каймінская група азёраў, або ля Полацкага тракту, побач з Катлоўкай, ледавік у свой час так спрытна пахадзіў і наваročаў, што ўсе віды беларускага ландшафту можна ўбачыць, стоячы на адным месцы. Многія беларускія пісьменнікі параўноўваюць і называюць Астравеччыну «беларускай Швейцарыяй». Вельмі трапна падыходзяць радкі з верша паэта Платона Галавача:

Не, не веру, брат, я, каб была прыгажэй
Па пякноце сваёй Швейцарыя!...
Паглядзі толькі ты, прыгледзься бліжэй
Вокам ясным на сіні-абшары...

Гэты рэгіён Беларусі спрыяльны для развіцця ўзнаўляльных крыніц энергіі. На кожнай малой рачулцы калісь былі запруды, дзе эфектыўна выкарыстоўвалася энергія вады. Яшчэ ў 1960-я гады, едучы па шашы з Астраўца ў Міхалішкі, можна было заўважыць ля вёскі Філіпаны, на ўзгорку, вятрак, які спраўна працаваў. У самым цэнтры Астраўца, на рацэ Лошы, дзейнічаў млын, які выкарыстоўваў энергію вады. За 5 км ад Астраўца, на рацэ Лошы, у 1955 годзе была пабудавана Янаўская ГЭС. Зусім недалёка ад яе, прыкладна на адлегласці 16 км, у ніжнім цячэнні ракі Ашмянкі, амаль на мяжы з Смаргонскім раёнам, была пабудавана Рачунская ГЭС. Гэтыя дзве электрастанцыі разам мелі магутнасць больш за 2000 Квт.

Два гады таму давялося пабываць на плацінах гэтых ГЭС. Адна плаціна ўтварае Янаўскае вадасховішча, а другая — Рачунскае. Вось дзе прыклады безгаспадарчага выкарыстання аб'ектаў, якія б давалі танную электраэнергію. Плаціны захаваліся, а будынкі, дзе месціліся генератары і абсталяванне — разрабаваныя, разбураюцца. Асаблівасцю энергіі ветру, вады, біямасы і сонца з'яўляецца тое, што «сыравіна» абыходзіцца амаль бясплатна і амаль заўсёды ў наяўнасці і ў бязмежнай колькасці, толькі што выдаткі на яе выкарыстоўванне сёння яшчэ даволі высокія.

Чаму замест адной гіганцкай АЭС не скіраваць сродкі на тысячы такіх мікрапраектаў, што дадуць жыццё тысячам мястэчак і вёсак? Напрыклад, у Германіі прыняты закон аб узнаўляльных крыніцах энергіі, ёсць прадпісанне аб эканоміі энергіі.

> Згодна з даследаваннямі, праведзенымі ведамствам радыяцыйнай бяспекі ў Германіі, захворванні лейкеміяй сярод дзяцей сустракаюцца тым часцей, чым бліжэй яны жывуць да адной з дзейных у краіне АЭС.

З Чарнобылем яшчэ не разабраліся да канца. Напрыклад, пару месяцаў таму вярнулі з Літвы 20 тон замарожаных беларускіх чарніцаў, бо ўзровень радыяцыі ў ягадах перавышаў норму ў 5 разоў. Як так, што беларускім санслужбам пляваць, і толькі літоўцы выявілі такое? А калі б ягады трапілі ў нашы крамы?

Вырашаць пытанне будаўніцтва АЭС у Беларусі трэба не ў цішы кабінетаў, а ўзважваючы розныя меркаванні. Дзяржаўныя СМІ падаюць максімум аргументаў «за». Прадстаўнікі мясцовай улады на Астравеччыне праводзяць агітацыйна-тлумачальныя размовы, пераконваючы мясцовых жыхароў у экалагічнай бяспецы будучага праекту, абяцаючы ледзь не рай на зямлі ў выпадку будаўніцтва АЭС у раёне. Мясцовыя ўлады не дазваляюць жыхарам Астравеччыны нават правесці пікет супраць АЭС.

Жыхары Астравеччыны, якія будуць жыць побач з АЭС, мала ведаюць пра небяспеку, звязаную з дзейнасцю гэтага аб'екту. Ніхто ім не кажа, што няма бяспечнага ўзроўню радыяцыі для чалавечага арганізму, які б нізкі ён ні быў. Згодна з даследаваннямі, праведзенымі ведамствам радыяцыйнай бяспекі ў Германіі, захворванні лейкеміяй сярод дзяцей да пяці гадоў сустракаюцца тым часцей, чым бліжэй яны жывуць да адной з 16 дзейных у краіне АЭС.

За год працы сярэдняя па магутнасці АЭС выпрацоўвае 1000–1400 кг радыеактыўнага смецця і 250–300 кг плутонію. Хаця на АЭС радыеактыўны пыл ачышчаюць з дапамогай фільтраў, але ўсё ж часцінкі трапляюць у ваду, папаўняючы такім чынам найбліжэйшы вадаём (не дай бог — Вяллю). Любая, нават самая дасканалая АЭС ставарае радыеактыўны фон. А праблема радыеактыўных адкідаў? Калі іх захоўваць пад зямлёй, то рана ці позна яны дадуць аб сабе знаць і ўжо напэўна атруцяць грунтовыя воды. Дзесяткі гадоў даследаванняў не зрабілі магчымым знайсці спосабу надзейнай ізаляцыі радыеактыўных адходаў ад навакольнага асяроддзя.

У выніку неабходнасці захоўваць усе гэтыя перасцярогі, ядзерная энергія — самая дарагая. Яна выжывае толькі там, дзе ўкладваюцца вялікія датацыі. Вядома, можна і будаваць танненька, і не ўсе нормы выконваць — што тады здараецца, мы пабачылі ўжо ў Чарнобылі.

Як можна размяшчаць ядзерны монстр у густанаселеным рэгіёне, паблізу возера Нарач з яго ўнікальным турыстычным рэсурсам?

Дзеля нашых дзяцей, унукаў трэба сказаць «не!» будаўніцтву АЭС на Астравеччыне.

**Бярнард Пакульніцкі, Гарадзея (Стаўбцоўскі раён)**

## На што пойдзе плутоній з АЭС?

Расія будзе будаваць два блокі беларускай АЭС. АЭС — гэта аб'ект шматлікага прызначэння. Пры працы АЭС, безумоўна, выпрацоўваецца плутоній-239. А дзе гарантыя, што Расія не дасць і тэхналогіі, цэнтрыфугі, і вось ужо гэта баявы плутоній, а гэта ўжо ядзерная дзяржава, і пры цяперашняй уладзе гэта небяспека і для Еўрасаюзу і для іншых?

**Мікалай Рыбакоў, Копысь (Аршанскі раён)**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Андрэю з Магілёва.** Верш надрукаваць не можам, бо ён па-расійску, а газета выходзіць па-беларуску.

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск. e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**

# Бог зімы

Рэпартаж з каляднага канцэрту **Змітра Вайцюшкевіча**.

І не пытайце мяне, хто такі Зюзя. Я яшчэ не ачуняў ад балючага факту, што Дзеда Мароза няма, а ёсць Святы Мікалай. І вось гэты Зюзя, значыцца, уцелавіўся ўчора ў Мінску. Як заваконны снег на галаву. Хаця будуць такія, якія сцвердзяць, што на канцэрце ў «Казе» (яе малой залі) з белым грымам вакол вачэй і пафарбаваным чырвоным носам быў не хто іншы, як Зміцер Вайцюшкевіч, які ўдала выдаваў сябе за зімняе боства. Што гэта менавіта ён цынічна скарыстаўся тым, што ніхто дакладна не ведае, як выглядаюць тыповыя беларускія боствы.

Прапяяўшы супольна з залай, Зміцеразюзя прыпусціў далей. Падзяліў і ўладарыў. Спачатку заложна спяваў з бацькамі. І прачула — з дзеткамі. Паддобрываў апошніх чарадой песняў пра анёлкаў (новы цыкл на вершы Арцёма Кавалеўскага), і дзеткі, бы анёлкі з самых песняў, вадзілі карагод перад сцэнай.

Закалыхваў, залюльваў жаночую палавіну. І ў мужчынскай частцы запанавала выразная ціша, калі жаночыя галасы суладна зацягнулі словы Вайцюшкевічава (Зюзевага?) шлягера: «Прыйдзі, мой каханы!». Мужчыны стурбавана абдумвалі, на каго ў час Калядаў варажылі іх палоўкі, падазраючы, што не на іх саміх.

Было цёпла і ўсё — дарэчы. Мы, сучасныя, дакладна не ведаем, але, пэўна, так і павінна быць, калі за акном вялікі-вялікі мінус, людзям хочацца пагрэцца, а ў хату неспадзеўкі прашыўся Зюзя.

Як можна сваё не любіць? Сваё жывое зімовае боства, якое хоча табе спадабацца і паслухмяна ператвараецца на тваё ўзважанне ў жаночае, мужчынскае ці дзіцячае. Калі яно поруч, паблізу, а не прывалаклося сюды з Лапландскай імперыі, каб, паадкрываўшы рот «пад фанеру», банальна зрубіць бабла. Учора звячора людзі сталі прывыкаць да свайго. І не пытайце мяне, хто такі Зюзя.

**Павал Касцюкевіч**

**Зміцер Вайцюшкевіч**
заснавальнік легендарнага фольк-гурту «Крыві». На пачатку 2000-х пачаў сольную кар'еру. Чалавек-аркестр, уладальнік аксамітнага вакалу, Зміцер выконвае рок, джаз, шансон, а таксама народныя песні (нават японскія). Піша песні на вершы смелых сучасных паэтаў — Барадуліна, Някляева, Дранько-Майсюка і Камоцкага. Найбольш удалыя праекты Вайцюшкевіча — альбомы «Паравіны году», «Танга з ружай» і «Паравоз кахання». Апошні альбом, што з'явіўся ў дыскарнях, — «Тое, што трэба».


PHOTO.BYMEDIA.NET

# Хай будзе святло!

Калядная акцыя «НН»: з дарункамі — у купалаўскую школу. Летась было 83 вучні, сёлета засталося 63 у Бяларучах Лагойскага раёну.

### Ноч музеяў па-бяларуцку

Ад'язджаем якіх 15 кіламетраў ад мінскай кальцавой у лагойскім кірунку і трапляем у школу сяла Бяларучы, дзе калісь вучыўся самы знакаміты рэдактар «Нашай Нівы» Янка Купала. Мы выправіліся туды не толькі натхніцца купалаўскімі мясцінамі, але прывезці дарункаў школьнікам і настаўнікам, пажыву для сэрца і цела: беларускія кніжкі і, вядома, цукеркі.

Школа сустракае нас адсутнасцю электрычнасці. Высвятляецца, што яе няма па ўсім раёне. Праз якіх пяць хвілінаў успыхвае кабінетная лямпачка. «Вой, прывезлі з сабой святло», — усміхаючыся, кажа дырэктарка Валянціна Петракоўская. Нам прыемна, і мы нешта такое дарэчнае, хваласпеўнае пра сябе кажам, але праз каторы час лямпачка зноў тухне.

У сутонні дырэктарскага кабінету слухаем пра школьную штодзённасць. Пра тое, як школа пакрысе агойтваецца пасля жахлівай смерці яе вучаніцы, Ірыны Кужэльнай, пра амаль стопрацэнтнае паступленне вучняў у ВНУ.

З ліхтарыкамі наведваем музей, што месціцца ў адным з унутраных кабінетаў школы. Галосна пагаджаемся, што такога мы ў сталіцы яшчэ не бачылі. Руплівa сабраныя экспанаты, неасветленыя, яны адно дадаюць праўдападобнасці, нібыта мы насамрэч увайшлі ў пакой старой вясковай хаты. Дрыготкае святло ліхтарыкаў выхоплівае першыя беларускія кнігі, «Лемантар», «Беларускую чытанку». Партрэт вучня бяларуцкага народнага вучылішча Янкі Купалы. Паэт тут год вучыўся і жыў непадалёк, у вёсцы. У цямрэчы дзіўнымі зломамі паўстаюць традыцыйныя сельскія прылады. Дарэчы, ад дырэктаркі музею Таісы Каранды даведваемся, што такое капыл. Па-сучаснаму — калодкі для абутку.

### Хай будзе святло!

Галоўны вораг купалаўскай школы — дэмаграфія. У выніку дэмаграфічнага крызісу і блізіні мегаполісу вучняў у бяларуцкай школе істотна паменела. Летась было 83 вучні, дык сёлета засталося 63. Школа яшчэ пару гадоў таму была сярэдняя, цяпер — толькі базавая (9 класаў), і ёй пагражае перайсці ў незайздросны шэраг «малакамплектных». «А як будзе 20 вучняў, то школу зачыняць увогуле», — бядуе настаўнік Мікола Ляшчун.

Але педагогі спадзяюцца, што Купала, як бы апякун школы, не пакіне іх.

Бо галоўнае, каб школа была: і для тутэйшых дзетак — каб ім не даводзілася ездзіць па навуку ў далёкія палесціны, і для беларушчыны — бо тут, здаецца, купалаўскі дух: дзеці пачынаюць пісаць вершы і апавяданні. І — чаго тут хаваць — для саміх настаўнікаў так трэба. Бо як закрыюць школу, то дзе працаваць настаўніку? У дадатак педагогі ж прыезджыя: вось сам спадар Мікола прыехаў з Палесся, ёсць вучыцелька з Брэсту — настаўнікі тут маюць дамы ў навакольных вёсках, тут прайшло іх жыццё, і, пэўна, вяртацца назад няма як. «20 гадоў у гэтым музеі. Вось што я буду без яго рабіць — гэта ж маё жыццё!» — кажа спадарыня Таіса.

У канцы візіту, пасля ўрачыстага ўручэння калядных дарункаў, здымаем на відэа школьную перамену. Няўрымслівыя лётанні, смех, — усё як зазвычай. Электрычнасць у раёне ніяк не наладзяць, але прасветлыя калідоры бяларуцкай школы не патрабуюць дадатковага святла — на дварэ пакуль што поўдзень кароткага зімовага дня.

**Павал Касцюкевіч, Яраслаў Сцешык і Раман Маладзяшын**
**Фота Яраслава Сцешыка**


Мікола Ляшчун, Валянціна Петракоўская і Таіса Каранда прымаюць падарункі.

## Жыве ў Бяларучах Купала

**Мікола Ляшчун**

Жыве ў Бяларучах Купала,
Душа Купалы будзіць нас.
Нязгаснай зоркаю заззяла,
Каб веры промень не пагас.

Тут Беларусь, як веру, вызнаў
І далучыўся да пяра,
Тут хвоі ля пясчаных выспаў
Люлялі мроі песняра.

У бліках залатога сонца
Прачулых мараў спеў пагляд,
Каб воля глянула ў аконца
І заквітнеў наш край, як сад.

Каб мову матчыну ад Бога,
Як памяць продкаў берaглі,
Ды безнадзейную аблогу
На роднай здолелі зямлі.

Імя Купалы ведаць мала —
Не забывайма кліч яго.
Жыве ў Бяларучах Купала,
Нібыта дух святых багоў.

ДЫСКАГРАФІЯ

## Іна Афанасьева

Буду с тобой,
West Records, 2008



**Куды там пнуцца з такім жудасным запевам «Аябудубудубуду»...**

Альбом Афанасьевай новым можна назваць толькі адносна. За пяць гадоў, што мінулі ад яе дэбютнага дыску, гэтыя песні добра навязлі на вушах, дзякуючы айчыннаму эф-эму. І калі яшчэ сама спявачка здольная сям-там зачараваць сваім голасам, то яе аранжыроўшчыкам, кампазітарам ды аўтарам песень гэта ўдаецца радзей. Быць бы Афанасьевай Цінай Цёрнер беларускай эстрады (ці хоць бы Ані Лорак), але выглядае хіба на Ірыну Салтыкову. Куды там пнуцца з такім жудасным запевам «Аябудубудубуду» і настальгічнай музыкай з нясмелым «закосам» пад Gold Ballads. Часам выходзіць нават густоўна, як у песеньцы «Перечитай» (праўда, надта ўжо падобна на поп-хіт з 1980-х). Але ў астатнім ёсць адчуванне, што слухаеш альбом чарговай «фабрыканткі», а не заслужанай артысткі Беларусі. Вось каб знайсці ёй не абцяжаранага стэрэатыпамі аранжыроўшчыка ды заспяваць на якой іншай мове, акром расійскай.

**Сяргей Будкін**

# Грамадства неананімных алкаголікаў, і дзякуй ТВ

**Калі тэлебачанне — гэта прагрэс і культура, то я супраць такога прагрэсу і культуры. Піша Наталка Бабіна.**

Калі ад рэдактара паступіла заданне напісаць матэрыял «пра навагоднюю «Батлейку» і тэлебачанне ўвогуле», я не пайшла да тэлевізара, а прыстроілася каля акна ў чаканні азарэння.

Ззяла восьмая гадзіна раніцы. З усходу, над недалёкімі гмахамі Мінску, якія займаюць палову далягляду, паднімалася чырвонае сонца. З другога боку па белым полі тонкая пазёмка вілася ў бок ляска, які мае назву Буйніцкая горка. Было ціха і чыста. Дрэвы ў шэрані, нібы замкі. Амялушкі ды снегіры пералятаюць з галінкі на галінку грэцкага арэха. З-за рогу вуліцы павярнула цёмная постаць. Яна пахіталася і мела ў руцэ бутэльку. Адчувалася, што ёй усё добра. Постаць прадэфілявала ўздоўж вуліцы, прыпынілася на хвілю, выжлукціла з бутэлькі апошняе і нязмушана шпурнула пустую пляшку пад мой плот, маючы намер рушыць далей.

Я высунулася ў акно:

— Яша! — гукнула я. — Ану забяры бутэльку!

— Паняў! — Яша паслухмяна падняў пустую пляшку, прыклаў два пальцы да шапачкі і пабрыў далей. — Няма праблем!

Я ведаю, што сваю пустую пляшку Яша выкіне пад наступным плотам. Ждановічы, вёска за 20 хвілін язды грамадскім транспартам ад цэнтру Мінску, патанае ў смецці: сельсаветы ў нас, у большасці сваёй, не для таго, каб займацца сметніцамі ды прыборкай вуліц; ім трэба ўзбагачацца, наразаючы кавалкі зямлі для багатых, ды арганізоўваць выбары. У Яшы двое дзетак, залатыя рукі аўтаслесара, пяцёра мопсікаў-выхаванцаў і ён алкаголік.

Ён адзін з тых шматлікіх, каго бачу кожны дзень на ждановіцкай вуліцы, пачынаючы з 8 гадзін раніцы. Каго бачу ля крамы, чыгуначнай станцыі і ля мясцовай бібліятэкі.

Не дам у крыўду алкаголікаў. Гэта, у большасці сваёй, самыя чулыя і дасціпныя людзі; алкаголікамі яны становяцца ад таго, што не могуць змірыцца з несправядлівасцю гэтага свету, але не знаюць, што з гэтым рабіць; яны ходзяць па зямлі слаба абутымі нагамі і чуюць галасы, нячутныя тым, хто не вылазіць з-за стырна «Лексуса». Такім быў мой дзядзька, такі мой стрыечны брат.

Гэта тонкія людзі, таму і няшчасныя. Не ўсе алкашы, у адрозненне ад Яшы, выклікаюць у мяне сімпатыю.

Пасля сёлетніх парламенцкіх выбараў на выніковым паседжанні Цэнтральнай выбарчай камісіі сябра ЦВК з правам дарадчага голасу Уладзімір Рамаскоўскі прапанаваў Лідзіі Ярмошынай «выключыць п'янкі з выбарчага працэсу. — Вы пра мяне? — перапытала яго Ярмошына. — Не, я пра продаж алкаголю на выбарчых участках», — адказаў Рамаскоўскі.

Красамоўна, праўда? Але не сімпатычна.

Гэта ўсё цікава, але прычым тут «Батлейка» ды тэлебачанне? — можа спытаць чытач. А пры тым, што, па маім нясціплым меркаванні, менавіта тэлебачанне і фармуе ў меру сілаў і таленту сваіх супрацоўнікаў розныя тыпы алкаголікаў — ад Яшы да Ліды.

І справа зусім не ў рэкламе піва.

У нашым доме тэлевізара не было паўгоду — выпадкова разбіўся, — і наша вялікая сям'я пачувалася выдатна. Ніякага жадання абзаводзіцца скрыняй не ўзнікала. Але вось перад Новым годам сярэдняя дачка запатрабавала купіць: бо як жа мы будзем сустракаць Новы год без сігналу дакладнага часу! Непарадак! Купіць мы так і не сабраліся, але пазычылі ў знаёмых: у іх чатыры тэлевізары, па колькасці пакояў у кватэры.

Уключылі. Паглядзелі пару перадач. У мяне, звыклай за паўгоду да безтэлевізійнага жыцця, быў шок.

**Навошта пошласць запіхваць у навагодняе шоу, якое па вызначэнні прызначана для сямейнага прагляду?**

Сказаць, што тэлебачанне атупляе — занадта мякка. Яно аскаціньвае.

Расійскія і беларускія каналы ўвогуле адкідаю ад разгляду — узровень іх найніжэйшы. Тут словаў нават траціць не хочацца.

Ад прагляду беларускіх каналаў мяне даўно ўжо адвучыў Аляксандр Зімоўскі: калі ў свой час ён вёў «Рэзананс», ягоная мова была настолькі насычаная непрыстойнымі параўнаннямі з галіны палавых вычварэнняў і фізіялагічных адпраўленняў, што я, памятаю, сур'ёзна клапацілася, каб падчас «Навін» і «Рэзанансу» ў пакоі не было дзяцей. З таго часу я пазбягаю слухаць і чытаць Зімоўскага са таварышы — як пазбягаеш уступаць у бруд.

Ксеня Сітнік, якая скакала па сцэне перад асавелымі пасля сытнага абеду дэпутатамі народнага сходу (сакавік 2006) дарабіла справу. З тых пор я пазбягаю і беларускіх канцэртаў у тэлевізары.

Аднак я вельмі ўзрадавалася, што навагодняя «Батлейка» будзе па-беларуску: гэта яшчэ адно яснае сведчанне стойкасці беларускай грамады; гэта перамога. Але абсалютна слабая рэжысура ўкупе з пашлаватымі эпізодамі, якімі поўнілася гэтая цягамоціна, звялі радасць на нішто. Чым аўтары хацелі пацешыць гледачоў у навагоднюю ноч? Байкамі Крапівы? У якім жа часе і чым жа яны жывуць, што чытаюць, пра што спрачаюцца? Дый, здаецца, на АНТ калі і могуць думаць, то толькі катэгорыямі шпрыцаў і порначасопісаў: няхай ужо імі поўніліся крэатыўныя рэпартажы з Плошчы, але навошта пошласць запіхваць у шоу, якое па вызначэнні прызначана для сямейнага прагляду? Па інерцыі ці сапраўды таму, што гэтага патрабуюць нейкія чорныя сілы, якім служыць АНТ?

Не, паўтор «Батлейкі» я глядзець не буду і дзецям не дам.

А як жа Белсат, адукацыйныя каналы, каналы добрых фільмаў? — запярэчыць чытач. Мне здаецца, у самой прыродзе тэлебачання ёсць нешта, накіраванае на выбіванне з чалавека чалавечага: ідзі па шляху найменшага супраціву; сядзь тут і глядзі на нас — мы ведаем, навошта жыць, як жыць і чым. Не пераключай каналы ці пераключай каналы — але заставайся з намі. Не варушыся, не думай, не мазгуй — глядзі. Ну даведаецца маё дзіця, патрацiўшы гадзіну, колькі гадоў жывуць сланы — і забудзе праз гадзіну. Ну паглядзіць фільм «Афіцэры» — са сцэнай, калі дзед-генерал прымае танкавы парад з маленькім унукам... Нічога вам гэта не нагадвае?

Толькі фізічныя целы імкнуцца да стану найменшай энтрапіі — калі такое адбываецца з чалавекам, чалавечае ў ім дэградуе. А гэта небязбольны працэс, і тут на дапамогу прыходзіць «добры доктар алкаголь, ён усім здымае боль»...

У нашых месцах пры Польшчы бутэлька гарэлкі каштавала пуд (16 кг) жыта.

Жыць было няпроста, але ні алкаголікаў, ні тэлебачання тады не было.

А вось гармонія і сэнс жыцця, здаецца, тады былі меншай таямніцай.

Ясны перац, я не кажу, што кругом алкашы ТОЛЬКІ ад таго, што павальна ў нашых дамах тэлевізары; што зямля паўсюдна засыпаная горамі смецця выключна ад гэтага; што ад гэтага мяняецца клімат. Але сваю вельмі вялікую лепту ўдавіца-ТВ ва ўсё гэта ўносіць.

Угледзьцеся ў твары тэлелюдзей: пустыя твары людзей, якія думаюць, што ведаюць, дзеля чаго трэба жыць. Нязводныя ўсмешкі. Шчырая няшчырасць, шчырае пазбяганне якога б то ні было сумнення — і гэта ў найлепшым выпадку. У найгоршым — сумленная хлусня.

Не, на такія твары любавацца я не хачу.

Памятаеце, у «Калыханцы» Чака Паланіка, герой, не ў сілах цярпець занадта галосную прастору, напоўненую «крывымі» словамі і бессэнсоўнымі гукамі, забіваў на адлегласці радыёвядучых? У мяне няма заклінання, пры дапамозе якога ён гэта рабіў. Але я магу выключыць тэлевізар і вярнуць яго гаспадарам. У адрозненне ад тэлебаб і тэледзядзькоў, я не ведаю, дзеля чаго жыве чалавек. Але дакладна не дзеля таго, каб сядзець ля тэлеэкрану.

Можаце лічыць мяне цемрашалкай, але калі тэлебачанне — гэта прагрэс і культура, то я супраць такога прагрэсу і культуры. Аднак тэлебачанне — не прагрэс і не культура.

Можа, канечне, я і не маю рацыі — але тэлевізар глядзець усё адно не буду.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Тэледзівы Паліна Смолава (з чаркай) і Люся Лушчык (з сабачкам).


Зорка Нью-Йоркскай джазавай сцэны Грэйс Гарланд

**18 студзеня а 19-й у клубе імя Дзяржынскага** выступ Грэйс Гарланд і квартэту Нью–Йорк–Масква. Грэйс Гарланд — вядомая ў ЗША выканаўца, прызнаная найлепшай джазавай спявачкай 2008 г.

## КАНЦЭРТЫ

**Да сонца**

**17 студзеня ў клубе «Стэп» (Прытыцкага, 62)** — фэст цёплай музыкі «Да сонца» з удзелам украінцаў **Mamanet, 4.А.Й.К.А** і беларусаў **«Адыс Абеба», CherryVata** і **The Shape**. **Пачатак а 18-й.**

**Тэатральна-музычная прорва творчасці на Фэсце Нікчэмнасцяў**

**22 студзеня а 19-й на малой сцэне к/з «Мінск»** «ветэраны творчага крызісу» ладзяць першы і развітальны канцэрт «Прывітанне, восень». Удзел бяруць **Ганна Хітрык, Міхаіл Зуй, Дзмітры Ясеневіч** і іншыя.

**Да 75-годдзя Саюзу кампазітараў**

**15 студзеня ў малой залі імя Р.Шырмы** выступае **дзяржаўны камерны хор Рэспублікі Беларусь. Пачатак а 19-й.**

**Прывітанне, Брадвей!**

**19 студзеня а 19-й у вялікай залі Філармоніі** — музычнае рэвю «Прывітанне, Брадвей!» на тэмы мюзіклаў «Кардэбалет», «Чыкага», «Эвіта», «Коткі», «42 вуліца», «Олівер», «Тыя, што спяваюць пад дажджом»…

## ВЫСТАВЫ

**Магнацкія партрэты**

**У Нацыянальным мастацкім музеі (Леніна, 20)** працуе новая сталая экспазіцыя адрэстаўраваных партрэтаў XVI—XVIII стст. з калекцый Радзівілаў, Агінскіх, Завішаў, Вішнявецкіх і іншых слынных велікалітоўскіх родаў.

**У гасцях у Карлсана**

**У дзіцячай бібліятэцы імя Астроўскага (пр.Газеты «Праўда», 20)** працуе інтэрактыўная выстава «Карлсан на даху». На выставе можна зайсці ў госці да Карлсана ў яговы домік, зазірнуць да Малога і пачытаць кніжку, седзячы ў яговым пакоі, а таксама паглядзець тэатралізаванае прадстаўленне на даху

**Таямніца смерці Купалы**

**У Літаратурным музеі імя Янкі Купалы** працуе выстава «Таямніца смерці». Яна прысвечаная апошнім гадам жыцця паэта.

**Да юбілею БССР**

**З 18 снежня ў галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі (пр.Незалежнасці, 116, 3-ці паверх)** працуе кніжна–дакументальная выстава «Гісторыя Беларусі: станаўленне нацыянальнай дзяржаўнасці», прымеркаваная да 90–годдзя з часу абвяшчэння БССР.

**Майстэрня**

**У мінскай галерэі «Акадэмія» Сурганава, 14) да 18 студзеня** працуе выстава мінскіх мастакоў Аляксея Хацкевіча і Аляксандра Някрашэвіча. Аляксей Хацкевіч працуе ў стылістыцы дэкаратыўна–абстрактнага рэалізму. На выставе сярод іншых будуць прадстаўленыя карціны з праекту «Вяселле» і «Карціны–коміксы». Аляксандр Някрашэвіч працуе на стыку поп–арту з выяўленчымі каламбурамі. На выставе будуць у тым ліку прадстаўленыя карціны з яго аўтарскага праекту «Цюнінг».

**Пейзажы часоў паўстання Каліноўскага**

**У Музеі гісторыі і культуры Беларусі (Маркса, 12) да 20 студзеня** працуе фотавыстава «Іспанская мазаіка», на якой прадстаўленыя творы майстра іспанскай пейзажнай фатаграфіі сярэдзіны XIX ст. Чарлза Кліфарда, выкананыя фатаграфам у 1852—1863 гг.

**Фідэль і Чэ**

**У Музеі гісторыі Вялікай айчыннай вайны (Кастрычніцкі пляц) да 31 студзеня** працуе выстава, прысвечаная 65–й гадавіне перамогі Кубінскай рэвалюцыі «Patria o muerta! Venceremos».

**«Нёману» —125**

**У Мастацкім музеі** працуе выстава «Свет шкла», прымеркаваная да 125–годдзя з дня заснавання шклозаводу «Нёман». Гэтая экспазіцыя — своеасаблівы прарыў у беларускай выставачнай дзейнасці, ва ўменні спалучаць прэзентацыю розных гістарычных эпохаў, жанраў, стыляў мастацтва, гісторыі і мастацтва.

**На захад ад Эдэму**

**У Музеі гісторыі і культуры** працуе выстава Жаны Будзейкі. У экспазіцыі — 69 партрэтаў, пейзажаў і нацюрмортаў.

**Мастацкая выстава ў сядзібе ТБМ**

**На сядзібе ТБМ** працуе выстава жывапісу і графікі маладых мастачак Наталлі Белавокай і Ганны Раманоўскай, сяброў Таварыства беларускай мовы і творчай суполкі «Пагоня». Уваход вольны.

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**

**15 (чц)** — «Пінская шляхта»
**16 (пт)** — «Таполевая завея»
**17 (сб)** — «Маэстра»
**18 (ндз)** — «Каханне ў стылі барока»
**19 (пн)** — «Чычыкаў»
**21 (ср)** — «Дзеці Ванюшына»
**22 (чц)** — «Ідылія»
*ранішнія спектаклі*
**18 (ндз)** — «Прыгоды Заранкі і Янкі»

**Тэатр юнага гледача**

**17 (сб)** — «Сястра мая Русалачка» (на сцэне ДК Прафсаюзаў)
**22 (чц)** — «Пацалунак ночы» (на сцэне ДК Прафсаюзаў)

**Тэатр імя Горкага**

**15 (чц)** — «Жаніхі»
**16 (пт)** — «Утаймаванне наравістай»
**17 (сб)** — «Ніначка»
**18 (ндз)** — «Валянцінаў дзень»

**Музычны тэатр**

**15 (чц)** — «Ноч у Венецыі»
**16 (пт)** — «Шклянка вады»
**17 (сб)** — «Прыгоды брэменскіх музыкаў»
**17 (сб)** — «Дон Жуан у Севільі»
**18 (ндз)** — «Айбаліт-2002»
**18 (ндз)** — «Баль кветак»
**20 (аўт)** — «Прынцэса цырку»
**21 (ср), 22 (чц)** — «Рускі фантом»

**Тэатр балету**

**15 (чц)** — «Рамэа і Джульета»
**17 (сб)** — «Карміна Бурана. Балеро»
**18 (ндз)** — «Дон Кіхот»
**21 (ср)** — «Лебядзінае возера»

**Тэатр оперы**

**16 (пт)** — «Яўгені Анегін»
**18 (ндз)** — «Чароўная музыка»
**20 (аўт)** — «Багема»
**22 (чц)** — «Алека»

**Тэатр беларускай драматургіі**

**16 (пт), 17 (сб)** — «Дзённік паэта»
**18 (ндз)** — «Хто пакахае мадам?»
**20 (аўт)** — «Жанчыны Бергмана»
**21 (ср)** — «Адвечная песня»

## ІМПРЭЗЫ

**ЖываЯ…**

**20 студзеня ў Музеі Максіма Багдановіча (Багдановіча, 7а)** — прэзентацыя кнігі Аксаны Спрынчан «ЖываЯ» ў 2–х частках. Уваход вольны. **Пачатак а 18-й.**

**Кірмаш мусамаў**

Суполка «Літаратурнае прадмесце» запрашае **14 студзеня ў Музей Багдановіча** на калядную вечарыну «Кірмаш мусамаў». У імпрэзе бяруць удзел: паэты Людміла Рублеўская, Віктар Шніп, Алесь Камоцкі, і іншыя. Усе прысутныя возьмуць удзел у распачатым галасаванні за кандыдатаў на атрыманне антыгламурнай літаратурнай прэміі «Блакітны Свін». **Пачатак а 18-й.** Уваход вольны.

**Паводле інфармацыі budzma.org, afisha.360.by**




## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Любоў-морква-2

**Любоў-морква-2**
(Любовь–морковь–2)

Расія, 2009, каляровы, 98 хвілін

**Рэжысёр:** Максім Пежэмскі

**Ролі выконваюць:** Крысціна Арбакайтэ, Гоша Куцэнка, Лідзія Вележава, Кірыл Плятнёў

**Жанр:** Камедыя

**Адзнака:** 6 (з 10)

З Новага году на мінскія экраны выйшла другая частка да мозгу костак маскоўскай кінакамедыі «Любоў–морква», сцэнар для якой напісаў беларус Андрэй Курэйчык.

Дзеці, хлопчык і дзяўчынка, нарадзіліся і ў сям'і Голубевых. На сваё дзесяцігоддзе блізняты мараць атрымаць сабачак, але ім дорацць робатаў. Бацькі не чуюць і не разумеюць сваіх дзяцей — і на дапамогу прыходзіць чараўнік–доктар. Ён мяняе дарослых і дзяцей целамі. Цяпер юрыст Андрэй і мастацтвазнаўца Марына мусяць спасцігаць цяжкасці школьнага жыцця.

Фільм чалавечны, хаця без навязлівых гламурна–рэкламных кадраў не абышлося. Увогуле, другая частка пераўзыходзіць першую. Яна і смяшнейшая, і энергічнейшая.

Курэйчык сказаў, што фільм не для фестываляў і крытыкаў. Наконт фестываляў — праўда. Фільм — для тых, хто жадае лёгка і весела адпачыць.

**Андрэй Расінскі**




**Фільмы ў Музеі гісторыі беларускага кіно (Сурганава, 4)**
**17 студзеня** — «Я, Францск Скарына»
**24 студзеня** — «Дзікае паляванне караля Стаха»
**31 студзеня** — «Рыжы, сумленны, закаханы»
**Пачатак сеансаў а 15-й**


Маю сёння я праграму
Завітаць у гэту краму.
Каб не пуставала хата
Грошыкаў аддам багата!
КРАМА
Дайце хуценька вы мне
Ды па зніжанай цане
Дзесяць ботаў, сто шкарпэтак,
Сем вазончыкаў для кветак,
Рондаль, слоік ды патэльня
Мне патрэбны вельмі-вельмі.
Гэту пральную машыну
Я ў краме не пакіну...
На паліцу зазірніце,
Тэлевізар мне знайдзіце
А яшчэ лядоўню,
Каб быў кошык поўны!
Не адзін, а цэлых два -
Не балела б галава!
Тры канапы, шафу, стол
А таксама - валідол...
Надта моцна б'ецца сэрца!
Я ж усё набыў, здаецца?
www.Tanaka.by
Капітан Танака © Алесь Кудрыцкі, 2009

# «Белсат»: тэлепраграма на 19—25 студзеня
# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал




### 19 студзеня, панядзелак

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Ранча», серыял, 9 серыя
**19.05** «Кветкі тут не растуць» (Flowers don’t grow here), дак. фільм, рэж. Шыра Пінсан, 2007 г., Італія
**20.00** Імпрэза гурту Svet Boogie Band на Фестывалі беларускай культуры і мастацтва (Варшава, 2008)
**20.20** Тыдзень з радыё «Свабода»
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Хто ёсць кім? Сяржук Вітушка
*Сяржук Вітушка — знакавая постаць беларускага моладзевага руху канца 1980-х. Менавіта ён стварыў у Мінску арганізацыю «Талака», якая сабрала разам патрыятычна арыентаваную моладзь Беларусі. Шмат для каго «Талака» стала штуршком да беларускасці і перадвызначыла далейшы лёс.*
**21.35** «Народжаныя для прытонаў» (Born into Brothels), дак. фільм, рэж. Зана Брыскі, 2004 г., ЗША
**23.00** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 7 серыя
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (гумарыстычная праграма)
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

### 20 студзеня, аўторак

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выданне)



**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 7 серыя
**19.00** Кухня (музычная праграма)
**19.35** «Рок-карона—2007», ч. 2
**20.20** «Кроў і попел Дражна», рэпартаж, 2008, Польшча
*19 красавіка 2008 г. у вёсцы Дражна Старадарожскага раёну былі усталяваны шасціканцовы крыж у памяць пра 25 мірных жыхароў, забітых у 1943 г. партызанамі трох савецкіх і аднаго габрэйскага атрадаў. Міліцыянты склалі пратакол на арганізатараў акцыі, інтэрпрэтаванай як «несанкцыянаваны сход», а крыж дэманціравалі. За гэты чын на 15 дзён арышту асудзілі грамадскага актывіста Вячаслава Сіўчыка і аўтара кнігі пра трагедыю вёскі Дражна Віктара Хурсіка.*
**20.40** YoLife! (моладзевая праграма)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Ток-шоу «Форум»: Бяздомныя — хто вінаваты?
**22.05** «Рэвалюцыя ў эфіры», дак. фільм рэж. Ізабэль Блёхль, Томас Штэлер, 2005 г., Нямеччына
**23.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 8 серыя
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (гумарыстычная праграма)
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

### 21 студзеня, серада

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 8 серыя
**18.55** Беларусы ў Польшчы
**19.15** «Крымская крыніца», дак. фільм, рэж. Яцэк Лэнскі, 2008 г., Польшча
**20.05** Віртуальная помпа (агляд Сеціва)
**20.25** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Рэпарцёр (інфармацыйная праграма)



**21.50** «Без рэтушы»: «Вызваленне», ч. 2, дак. фільм, рэж. Вольга Мікалайчык, 2008 г., Беларусь
**22.25** Госць «Белсату»: перадача пра надзённыя праблемы Беларусі
**22.45** Бульбаны



**23.00** «Мент», дэтэктыўны серыял, 12 серыя
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

### 22 студзеня, чацвер

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Мент», дэтэктыўны серыял, 12 серыя
**19.05** «Хадзіце на мой голас», рэпартаж, 2008 г.
**19.30** «Права быць свабодным», канцэрт альтэрнатыўнай музыкі (Луцк, 2007), ч. 1. Выступ гуртоў «Сцяна», «:B:N:» і «Тінь Сонця».
**20.00** «Дзённік «Народнага альбому», дак. фільм, рэж. Уладзімір Колас, 2007 г., Беларусь / «Мая дачка — тэрарыстка», дак. фільм, 2007 г., Данія
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Сальда (эканамічная праграма)
**21.35** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**22.10** Інтэрнаўты выбіраюць
**22.45** «Мент», дэтэктыўны серыял, II сезон, 1 серыя
**23.40** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (гумарыстычная праграма)



**00.00** Аб’ектыў (навіны)

### 23 студзеня, пятніца

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Мент», дэтэктыўны серыял, II сезон, 1 серыя
**19.00** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**19.25** Хто ёсць кім? Алесь Лось
*Пра сябе і пра сусвет расказвае чалавек, які імкнецца знайсці ў наваколлі сваё месца і ганарыцца, што ведае, дзе цэнтр сусвету. Гэта Алесь Лось. Ён шукае праўды ў старых ліцвінскіх мясцінах і людзях ды шчаслівы ў гэтым пошуку. Бо хоча заўсёды быць на вяршыні свайго сусвету, ніколі не рабіць таго, што вядзе да гвалту, таго, чаго не прымае душа. Менавіта тады, як лічыць Лось, не будзе падставаў для з’яўлення дыктату.*
**19.45** Кружэлка (сусветная музыка)
**20.15** «Без рэтушы»: «Па кім маўчыць звон?», дак. фільм, 2008 г.
**20.40** Паштоўка з Вільні (праграма пра беларусаў Літвы)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Госць «Белсату»: перадача пра надзённыя праблемы Беларусі
**21.35** Happy New York, маст. фільм, рэж. Януш Заворскі, 1997 г., Польшча
**23.10** «Пітбуль», серыял, 10 серыя
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

### 24 студзеня, субота

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода»
**18.45** «Крыкуны», дак. фільм-канцэрт, рэж. Міка Ронкайнен, 2003 г., Данія—Фінляндыя
**20.00** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**20.25** Падземка (беларускі хіт-парад)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Маю права (прававая праграма)




**21.40** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**22.10** «Развод» (Confidence), маст. фільм, рэж. Джэймс Фоўлі, 2003 г., Германія—ЗША. У ролях: Эдвард Бёрнс, Ліпэнд Орсэр, Дастын Хофман ды інш.
*Джэйк Віг — хітры, але сімпатычны махляр. Апошні «развод» Джэйка моцна нашкодзіў мафіі, бо пры дапамозе сваёй каманды ён скраў некалькі тысячаў даляраў у Лаянэла Долбі, бухгалтара вельмі аўтарытэтнага боса мафіі Уінстана Кінга. Каб выкруціцца з небяспечнай сітуацыі, Джэйк прыдумаў яшчэ больш вытанчанае махлярства, для ажыццяўлення якога спатрэбіцца здраўды творча падысці да справы. Аднак на шляху Джэйка з’яўляюцца розныя перашкоды, адна з якіх — махлярка Лілі, у якую Джэйк раптоўна закахаўся...*
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (гумарыстычная праграма)
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

### 25 студзеня, нядзеля

**18.00** Прэс-экспрэс (агляд друку)



**18.15** «Ранча», серыял, 10 серыя
**19.10** «Народны альбом», мюзікл, рэж. Міхал Анемпадыстаў, 1999 г., Беларусь.
**20.15** «Соня і яе сям’я» (O Soni a jej rodine), дак. фільм, рэж. Даніела Руснакава, 2006 г., Славакія
*Дакументальная стужка паказвае сучаснае жыццё цыганоў ва Усходняй Славакіі. Галоўная гераіня фільму — Соня, маці чатырнаццаці дзяцей, якая чакае нараджэння чарговага. Побыт сям’і незайздросны: малая хаціна, дзеці п’юць ваду з найбліжэйшага ручая, шукаючы ежу на сметніку, крадуць з дзяржаўнага лесу дровы. Адзін з сыноў ужо трапіў за краты.*
*У Беларусі цыганскае пытанне застаецца па-за колам актуальных для грамадства праблемаў.*
**21.00** Аб’ектыў (вынікі тыдня)
**21.25** Ток-шоу «Форум»: Як абараніцца ад крызісу?
**22.15** «Чалавек, якога там не было» (The Man Who Wasn’t There), маст. фільм, рэж. Джоэл Коэн, 2001 г., ЗША.
*ЗША. Канец 1940-х — пачатак 1950-х. Эд Крэйн працуе цырульнікам, але гэта не ягонае пакліканне. Як і ўсе, ён верыць у амерыканскую мару. Эд пагаджаецца на прапанову аднаго са сваіх кліентаў узяць удзел у новым для таго часу бізнесе — хімчыстцы адзення. Але для гэтага трэба пэўная сума грошай. Эд даўно заўважае, што ў ягонай жонкі Дорыс раман з паспяховым бізнесоўцам, сябрам сям’і, Дэйвам Бамбізам...*
**00.10** Аб’ектыў (вынікі тыдня)

# Хіба мой Цуцык не сабака?

Кароль порнаіндустрыі папрасіў у Кангрэсу ЗША датацыю на ўратаванне свайго бізнесу ад крызісу.

Лары Флінт, кароль порнаіндустрыі, чый жыццяпіс быў увекавечаны ў кінастужцы Мілаша Формана «Народ супраць Лары Флінта», папрасіў у Кангрэсу ЗША грашовую дапамогу памерам 5 мільярдаў даляраў для галіны эканомікі, у якой ён заняты, ды якая, на думку бізнесоўца, «таксама зазнае вялікія фінансавыя цяжкасці».

Амерыканскі ўрад займаецца цяпер упырскваннем грошай у гібеючыя галіны эканомікі. Першымі вялікую фінансавую дапамогу ўжо атрымалі амерыканскія вытворцы аўто. «Нам здаецца, што цяпер кангрэс па-сур'ёзнаму ўзяўся выбавіць з бяды найважнейшыя галіны айчыннай эканомікі, а мы ж глыбока перакананыя, што вартыя роўнага стаўлення, — кажацца ў Флінтавай заяве. — У цяжкую часіну, каб зазнаць палёгку, амерыканцы звяртаюцца да ўсялякіх забаваў. І сярод найпапулярнейшых — забавы «для дарослых».

«Сёння ўсе, ад банкаў да Вялікай Тройцы (тры найбуйнейшыя аўтамабільныя кампаніі), просяць, каб дапамаглі менавіта ім, — дадае прэсавы сакратар Флінта Эван Морган. — І як усе астатнія пацярпелыя ад эканамічнага запавольвання, порнаіндустрыя таксама просіць грашовую дапамогу, каб ачуняць».

**ЛК, паводле АР**




**Жыхары Балгарыі пратэстуюць супраць спынення паставак газу.**




**У шафе Інстытуту даследавання мозгу Расійскай Акадэміі навук. У любы момант можна дастаць...**

## «НН» запрашае на сталую працу

«НН» запрашае на сталую працу маладых журналістаў. Вакантныя спецыялізацыі: 1) крымінальная хроніка, 2) гісторыя, 3) музыка, кіно, субкультуры. Заробак стабільны, калектыў беларускі. Шмат падарожжаў гарантуецца. Прапановы і звесткі пра сябе кіруйце на э-пошту nn@nn.by. Рэкамендацыі і досвед працы вітаюцца, але не канечне, каб яны былі. Карэспандэнт можа быць студэнтам.

## «НН» і ARCHE ў Гродне

**16 студзеня (пятніца) а 18.30 у Гродне (Будзённага 48 а, зала 100 (былая майстэрня Іваноўскага)** абудзецца ўрачыстае ўручэнне штогадовай прэміі часопісу ARCHE «За сумленнае слова» гродзенскаму журналісту Андрэю Пачобуту. Прыедуць Валер Булгакаў, Павал Севярынец, Павал Касцюкевіч. Падчас імпрэзы можна будзе азнаёміцца з «ваенным» і «ВКЛаўскім» нумарамі ARCHE, кнігамі Адама Станкевіча і Паўла Севярынца ды іншай папулярнай літаратурай на беларускай мове. Запрашаюцца ўсе ахвочыя.




**Рэпетыцыя інаўгурацыі Барака Абамы. Ролі выконваюць агенты вайсковай разведкі ЗША. Каб унікнуць збояў, разыгрываецца ўсё ў дакладнасці як будзе 20 студзеня.**

## АНЕКДОТ

Абы работа была.

Сустракаюцца два дырэктары:
— Ты сваім зарплату плаціш?
— Не.
— І я не. А яны ўсё адно на працу ходзяць?
— Ходзяць.
— І мае ходзяць. Можа, уваход платны зробім?
Сустракаюцца за тыдзень:
— Ну што, здолеў платным уваходам выгнаць?
— Ні халеры — яны, гады, каб эканоміць, у панядзелак уранку прыходзяць і жывуць да пятніцы.

**Паводле gazetaby.com**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАННІ

**Дарагая баба Таня!** Віншую цябе з Днём народзінаў і абдымаю сваімі маханькімі руцкамі. Твая ўнучка Яраслава

**Спадарыню Тацяну Водзіч** віншуюць з юбілеем сябры-аднадумцы з Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі БНФ і зычаць плённай працы і барацьбы на ніве Бацькаўшчыны

### ЖЫТЛО

**Сям'я (дачцэ 6 г.) шукае** хоць якое жытло з двума пакойчыкамі, найлепей у прыватным сектары. Тэрмінова — гаспадыня зганяе, бо прадае кватэру. Т.: 122-87-44

### ПРАЦА

**Шукаем стыльрэдактара** беларускіх тэкстаў. yzz567x@yahoo.com

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

У нас людзі вельмі ласыя да святаў. Святкуюць, здаецца, больш як на ўсім свеце. Святкуем часта і каталіцкія, і праваслаўныя святы, ды яшчэ свае беларускія. Дый ёсць нават святы скацінскія: вясной па пятніцах да Юр'я канём ці валамі рабіць нельга. Калі добра палічыць, дык выйдзе, што працуем у годзе дзён сто, а рэшту дзён ляжым на печы, або яшчэ горш — сядзім у шынку.

**Банадысь**
**«Наша Ніва». №2. 1909**

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Кошт свабодны. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6000. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 13.01.2009.
Замова № 165.
ISSN 1819-1611
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12